КАЛІ З СЯБРОЎСТВА НАРАДЖАЕЦЦА КАХАННЕ

Сямейная гасцёўня

ХІМІЯ ЛЁСУ

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

15 КРАСАВІКА 2021 г. ЧАЦВЕР № 70 (29439)

ЦЫТАТА ДНЯ

Наталля КАЧАНАВА, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:

«Хоць у Савет Рэспублікі як верхнюю палату парламента паступаюць законапраекты, якія раней ужо былі прынятыя дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў, сенатары падключаюцца да работы і на больш ранніх стадыях — на пасяджэннях камісій, вядуць дыскусіі з экспертамі, зацікаўленымі людзьмі. Вельмі шмат выязджаем у рэгіёны, сустракаемся з людзьмі для таго, каб адчуць, як гэты законапраект будзе працаваць у жыцці. Таму дэбаты ёсць, і спрэчкі ёсць. Цяпер вельмі шмат новых законапраектаў — аб недапушчальнасці рэабілітацыі нацызму, ахове персанальных даных. Аб дзяржаўнай службе будзе практычна новы законапраект. Таму спрэчак хапае. Але разам з тым мы заўсёды знаходзім агульную мову для таго, каб прыняць правільнае рашэнне і каб законапраект быў жыццяздольны».

Цеснае ўзаемадзеянне і высокі давер

Сустрэча Аляксандра Лукашэнкі і Ільхама Аліева мела і палітычны, і эканамічны плён

Фота БелТА.

Афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Баку пачаўся ў аўторак нефармальнай сустрэчай з азербайджанскім калегам Ільхамам Аліевым.
Але асноўныя перагаворы адбыліся ўчора.

Прэзідэнты пачалі рабочы дзень афіцыйнай сустрэчай у рэзідэнцыі «Загульба», што ў 40 кіламетрах ад Баку на беразе Каспійскага мора. Перагаворам папярэднічала пратакольная цырымонія фатаграфавання. Пасля прэзідэнты спусціліся ў залу перагавораў. Сустрэча лідараў праходзіла ў вузкім складзе з удзелам міністраў замежных спраў, затым у шырокім — далучаліся астатнія члены дэлегацый.

У пачатку перагавораў, як перадае БелТА, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што перашкодзіць супрацоўніцтву Беларусі і Азербайджана не можа ні адна пандэмія.

«Напэўна, наша сустрэча ў нейкай ступені прагучыць рэфрэнам на фоне гэтых усіх падзей: пандэміі і іншага. Але сапраўдныя сябры не адкладваюць на доўгі час тыя мерапрыемствы, якія трэба правесці своечасова. Перашкодзіць гэтаму не можа ні адна пандэмія», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Пасяўныя далягляды

Сяўба ідзе поўным ходам па ўсёй краіне, нават у самым паўночным яе рэгіёне. Механізатары ААТ «Адраджэнне» Віцебскага раёна сеюць яравы ячмень. Сёлета ім неабходна пасеяць яравых збожжавых на 1,16 тысячы гектараў.

Фота БелТА.

Галоўны аграном Ігар ЯЗЭПЧАНКА і механізатар Васіль ТРАПЯНОК.

КАРОТКА

- **Пытанне аб выдачы ліцэнзіі на эксплуатацыю першага энергаблока БелАЭС плануецца разгледзець у маі.**
- Мінскі аўтамабільны завод захоўвае лідарства на рынку грузавікоў ва Украіне.
- **У Беларусі ў 2020 годзе колькасць выяўленых фальшывых грошай зменшылася на 23,8 %.**

ISSN 1990 — 763X

Разумныя грошы

САМЫЯ ВЯЛІКІЯ ПРАЦЭНТЫ — У РУБЛЁВЫХ ДЭПАЗІТАХ

На якіх банкаўскіх укладах заробіш больш

Як толькі ў нас з'яўляюцца лішнія грошы, адразу ўзнікае пытанне, куды іх укласці, каб яны прынеслі нейкі дадатковы прыбытак. У фінансістаў наконт гэтага прапаноў хапае. Аналітыкі ўпэўненыя, што грошы павінны працаваць нават тады, калі поспехі ў эканоміцы не такія відавочныя... Зберажэннямі трэба проста правільна кіраваць. Як гэта рабіць — тут кожны выбірае свой алгарытм.

Уклад з'яўляецца адным з варыянтаў, які дапаможа зберагчы і разам з тым пусціць у абарачэнне і прымножыць свае грашовыя сродкі. Аднак, каб не пралічыцца з такой інвестыцыяй, варта спачатку разабрацца, на што звярнуць увагу, каб у выніку не застацца ў мінусе.

Валюту зберажэнняў выбірайце самі

Нядаўна добры знаёмы майго бацькі (абодвум ужо за 80) нечакана звярнуўся да мяне з просьбай. Справа ў тым, што гэты ўжо немалады чалавек вырашыў памяняць валюту сваіх зберажэнняў. Валют на рынку шмат, а якую выбраць, ён не ведае.

Найлепшай валютай для зберажэнняў гэтай вясной стане долар, расказаў **эксперт па фондавым рынку адной маскоўскай інвестыцыйнай кампаніі Дзмітрый БАБІН.** Па словах фінансіста, валюты, якія былі фаварытамі летась, паступова ператвараюцца ў аўтсайдараў, хоць і даражэлі апошнія 9 месяцаў. Гаворка ідзе пераважна пра валюты еўрапейскіх краін, якія не ўваходзяць у зону еўра (Балгарыя, Венгрыя, Данія, Польшча, Румынія, Харватыя, Чэхія, Швецыя), а таксама валютах тых краін, якія развіваюцца, і з сыравіннымі эканомікамі, якія будуць «падаць» у параўнанні з долорам, удакладніў эксперт.

СТАР. 4

Цеснае ўзаемадзеянне і высокі давер

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт адзначыў, што краіны дывэрсіфікавалі свае адносіны ў палітыцы і эканоміцы. «Мы нікому не перашкаджаем, і нам ніхто стараецца не перашкаджаць. Таму што калі ты хочаш нешта зрабіць, то цяжка гэтаму перашкодзіць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, тавараабарот паміж Беларуссю і Азербайджанам, які летась наблізіўся да паўмільярда долараў, — гэта добры вынік з пункту гледжання дынамікі.

«Што датычыцца нашых палітычных адносін, цяжка сказаць, чаго нам не хапае. У нас бліскучыя адносіны. І я гэтым заўсёды ганарыўся. Мы аднавілі самыя цёплыя адносіны з часоў Савецкага Саюза па ўсіх напрамках», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы прапанаваў паглыбіць супрацоўніцтва ў пастаўках вуглевадародnай сыравіны.

«Нам, можа, трэба недзе разгледзець пытанне паглыблення адносін менавіта ў гэтай сферы. Вельмі, зразумела, тонкае і далікатнае пытанне з прычыны таго, што Беларусь знаходзіцца ў эпіцэнтры эканамічных і палітычных падзей. Але тым не менш няма невырашальных пытанняў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў на перагаворах адзначыў, што супрацоўніцтва паміж краінамі паспяхова развіваецца як у палітычнай сферы, так і ў эканоміцы. Паводле яго слоў, беларуска-азербайджанскім сувязям была нададзена такая дынаміка, што развіццё ідзе па ўсіх напрамках.

«Нашы ўзаемныя візіты маюць рэгулярны характар. Гэта ўсё сведчыць аб цесным палітычным узаемадзеянні, высокім узроўні даверу паміж краінамі і нацэленасці на вынік», — заявіў Ільхам Аліеў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з журналістамі пасля перагавораў адзначыў, што бакі правялі грунтоўную рэвізію адносін. «Нашы ацэнкі становішча ў свеце цалкам супадаюць. Ёсць яснасць адносна далейшых сумесных дзеянняў ва ўмовах крызісу сусветнай эканомікі, пандэміі і, самае галоўнае, неадназначных прагнозаў на перспектыву», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама ён звярнуў увагу, што Беларусь шчыра вітае дамоўленасці аб поўным спыненні ваенных дзеянняў у зоне нагорна-карабахскага канфлікту.

«Мы шчыра вітаем дамоўленасці аб поўным спыненні ваенных дзеянняў у зоне нагорна-карабахскага канфлікту. Гэта важнае палітычнае рашэнне, якое павінна стаць асноўвай трывалага міру ў рэгіёне», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Па выніках перагавораў бакі падпісалі некалькі дакументаў аб развіцці супрацоўніцтва ў розных сферах. Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі заключыла мемарандум аб узаемаразуменні з Агенцтвам харчовай бяспекі Азербайджана аб супрацоўніцтве ў галіне ветэрынарыі. Мемарандум аб узаемаразуменні па пытаннях супрацоўніцтва ў энергетычнай сферы падпісалі кіраўнікі міністэрстваў энергетыкі. Яшчэ адзін мемарандум заключаны паміж беларускім Нацыянальным агенцтвам па турызме і Дзяржаўным агенцтвам па турызме Азербайджана. Акрамя таго, дыстанцыйна падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж канцэрнам «Белнафтахім» і кампаніяй SOCAR.

Парламенцкі дзённік

АСНОВА ЛЮБОГА ГРАМАДСТВА

Дэпутаты абмеркавалі новаўвядзенні ў Кодэкс аб адукацыі

На мінулым тыдні Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў першым чытанні прыняла законапраект «Аб змяненні Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі». Абмеркаванне новага законапраекта актыўна працягваецца. Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ і член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Сяргей КЛІШЭВІЧ сустрэліся з усімі зацікаўленымі на дыскусійнай пляцоўцы ў адным з раёнаў сталіцы. Прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, навучальных устаноў, бацькі абмеркавалі, якой будзе беларуская адукацыя заўтра.

«Мы правялі шырокую кампанію ў Кастрычніцкім раёне Мінска і сабралі прапановы ад многіх навучальных устаноў. Нас цікавіла, якія яны бачаць праблемы і аб чым жадаюць пагаварыць, каб эфектыўна выкарыстоўваць Кодэкс аб адукацыі. Ён мае сапраўды прынцыповае значэнне. Сістэма адукацыі — гэта аснова любога грамадства. І ад Кодэкса аб адукацыі залежыць будучыня дзяржавы. Усе дэпутаты вельмі актыўна ўключыліся ў гэтую дзейнасць. Наша задача пры паступленні новых законапраектаў — паглядзець на баланс грамадскіх інтарэсаў, інтарэсаў розных сацыяльных груп. І зрабіць так, каб закон быў збалансаваны і адказваў агульнанацыянальным інтарэсам», — расказаў Андрэй Савіных.

Удзельнікі гэтай дыскусійнай пляцоўкі засяродзілі сваю ўвагу на пытаннях, якія датычацца школьнай адукацыі. Сярод іх — профільныя і базавыя класы, парадак прыёму ў профільныя класы, трэцяя ступень адукацыі, ахова школ. Цікавасць выклікала пытанне, звязанае з удзелам бацькоў у адукацыйным працэсе. Прадстаўнікі Міністэрства адукацыі падкрэслілі, што ніякіх абмежаванняў для бацькоў няма. Але, згодна з новай рэдакцыяй Кодэкса аб адукацыі, парадак удзелу бацькоў у навучальным працэсе будзе ўстаноўлены кіраўніком навучальнай установы. Гарачую дыскусію выклікала тэма прыёму ў гімназіі — крытэрыі адбору, якія будуць больш жорсткія, арганізацыя вучобы гімназістаў у профільных класах, навучальныя праграмы. Прапанова зрабіць для вучняў 10-11 класаў шасцідзённы вучэбны тыдзень не знайшла падтрымкі. Субота застанецца днём працоўнага і фізічнага развіцця навучэнцаў, у гэты дзень могуць праходзіць факультатыўныя заняткі. Пандэмія каранавіруса паставіла перад навучальнымі ўстановамі пытанне аб дыстанцыйным навучанні, якому знайшлося месца ў новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі. Гэта тэма стала важнай для ўдзельнікаў дыскусійнай пляцоўкі, яны абмеркавалі плюсы і мінусы такой формы навучання, яе ўплыў на развіццё навучэнцаў і эфектыўнасць засваення ведаў такім чынам. Прыйшлі да высновы, што школа патрэбная дзецям не толькі як крыніца ведаў, але і як спосаб сацыялізацыі. Таму дыстанцыйнае навучанне стане дадатковым інструментам традыцыйнага адукацыйнага працэсу.

Як падкрэсліў Сяргей Клішэвіч, Кодэкс аб адукацыі — гэта адзін з дакументаў, які датычыцца кожнага жыхара нашай краіны. Так ці інакш ён закранае ўсё наша насельніцтва. І ў сувязі з гэтым узнікае мноства пытанняў падчас яго абмеркавання і прыняцця.

На думку дэпутатаў, адно з важных пытанняў — як абараніць настаўніка ад пэўных праблем, з якімі яны сутыкаюцца ў школе, даць настаўнікам ахову. «Мы бачылі выпадкі, калі да настаўніка ставяцца абуральна, і мы не павінны больш такога дапусціць. У Кодэксе аб адукацыі будуць замацаваны правы педагогаў. На парадку дня знаходзіцца выхаваўчы аспект. У Кодэксе звяртаецца ўвага на лібералізацыю адносін «вучань—настаўнік—бацькі», каб у гэтым трохвугольніку былі выкананы інтарэсы ўсіх бакоў: дзеці маглі спакойна вучыцца, настаўнік мог спакойна выконваць сваю работу», — падкрэсліў парламентарый, заўважыўшы, што да абмеркавання новай рэдакцыі Кодэкса актыўна падключыліся і настаўнікі, і бацькі.

Валерыя СЦЯЦКО.

Актуальна

ДЗЕЛЯ НАРОДНАГА АДЗІНСТВА

трэба згуртаваць канструктыўныя грамадскія ініцыятывы

У Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу прайшоў круглы стол «Беларускі саюз жанчын і маладзёжная ініцыятыва», на якім былі вызначаны новыя формы супрацоўніцтва паміж грамадскімі арганізацыямі і ўладай дзеля кансалідацыі канструктыўных сіл. Таксама падчас мерапрыемства БСЖ абвясціў акцыю «Я, мы памятаем!», якая мае на мэце прыцягнуць увагу моладзі да спадчыны Вялікай Перамогі.

«Грамадзянская ініцыятыва — найважнейшы рэсурс у дасягненні мэт развіцця любой дэмакратычнай дзяржавы. І наша краіна тут не выключэнне, — заявіў **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерый МІЦКЕВІЧ.** — Ацэньваючы сітуацыю ў гэтай сферы, мы можам сказаць, што сучасная беларуская грамадзянская супольнасць выглядае досыць спелай. Гэта магутная разгалінаваная структура, якая валодае вялікім творчым патэнцыялам. Разам з тым відавочна, што нам трэба будзе яшчэ шмат чаго зрабіць, каб павысіць ролю і значэнне такога дэмакратычнага інстытута ў рэалізацыі стратэгіі эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця Беларусі».

Паводле яго слоў, вельмі важна, каб розныя грамадскія арганізацыі змаглі сёння знайсці рэальныя агульныя падыходы для аб'яднання сваіх намаганняў у вырашэнні прынцыповых для жыцця краіны і грамадства пытанняў.

«Гэта задача асабліва актуальная ў Год народнага адзінства. І мэта нашай сустрэчы якраз у тым, каб намеціць новыя формы такога супрацоўніцтва і прапанаваць магчымыя кірункі і алгарытмы ўзаемадзеяння іншым структурам грамадзянскай супольнасці. Кансалідацыя ўсіх канструктыўных сіл — сёння гэта і ёсць магістральны напрамак развіцця нашых дэмакратычных інстытутаў. Дадзеная ідэя выразна прагучала на Усебеларускім народным сходзе. І важнасць яе рэалізацыі асабліва падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, — адзначыў намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў. — Цяперашняя наша сустрэча, якая, дарэчы, арганізавана па ініцыятыве жанчын-дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, можа стаць важным практычным крокам у гэтым кірунку».

Валерый Міцкевіч падкрэсліў: нямала вартых увагі праектаў рэалізавана Беларускім саюзам жанчын, які дзякуючы сваім гуманітарным, асветніцкім і дабрачынным акцыям ужо даўно набыў шырокую вядомасць і заслужаны аўтарытэт як у Беларусі, так і за мяжой.

«Творчы патэнцыял жаночых і маладзёжных арганізацый практычна невычэрпны. І ў прынцыпе ініцыятыва інтэграваць гэтыя патэнцыялы ўяўляецца вельмі своечасовай і актуальнай, асабліва ў кантэксце пытанняў аб захаванні народнага адзінства. Бо яе рашэнне дапаможа забяспечыць непарыўную сувязь і пераемнасць пакаленняў, — сказаў ён. — Вельмі важна, каб нашы дзеці цанілі тыя ж каштоўнасці, якія аб'ядноўваюць беларускі народ. Неабходна дабіцца, каб голас рэальнай народнай большасці выразна гучаў не толькі ў дні правядзення ўсебеларускіх форумаў і мемарыяльных акцый. У гэтым плане вельмі паказальна, што і Саюз жанчын, і БРСМ, і іншыя маладзёжныя структуры нацэлены на падтрыманне сацыяльнай стабільнасці, грамадзянскага міру, грамадскай згоды і актыўнае супрацьдзеянне ўсім формам гвалту».

Каштоўнасным ядром ідэі, які згуртаваў цалкам розных людзей у арганізацыях, з'яўляецца патрыятызм, памяць пра гістарычнае мінулае, захаванне духоўна-маральнай і культурнай спадчыны.

«Сёння мы праводзім круглы стол з прадстаўнікамі 24 маладзёжных арганізацый, якія працуюць у нашай краіне. Яны канструктыўныя і не на словах разумеюць, што такое патрыятызм, Радзіма і што такое мерапрыемствы, якія трэба ладзіць на карысць іншых людзей, — сказала журналістам **старшыня Беларускага саюза жанчын, першы намеснік міністра аховы здароўя Алена БОГДАН.** — Вядома, Беларускі саюз жанчын разглядае гэтую пляцоўку яшчэ і як перспектыўны кадравы рэзерв, каб прыцягнуць у нашыя шэрагі найбольш актыўных і мэтанакіраваных дзяўчат. Мы хочам даць старт вельмі цікавай і важнай акцыі «Я, мы памятаем», якую сёлета БСЖ вырашыў правадзіць як вочна, так і віртуальна».

Акцыя заклікана прыцягнуць увагу моладзі да спадчыны Вялікай Перамогі, да памяці аб тых падзеях, якія адбываліся на тэрыторыі нашай краіны. Чэленджы пройдуць у TikTok і Instagram. Да 22 чэрвеня Беларускі саюз жанчын плануе запусціць аўдыяпадкасты на ключавых падкаст-платформах і адмысловым канале на YouTube, на якім будуць сабраны аўдыярасказы пра вайну.

«Што можа БСЖ перадаць моладзі? Напэўна, сёння той час, калі мы павінны навучыцца чуць моладзь, ведаць, чаго яна хоча, як бачыць свой удзел у кіраванні дзяржавай і сябе ў выказванні грамадзянскай пазіцыі. Мы лічым, што Беларускі саюз жанчын — добрая дыялогавая пляцоўка, каб пачуць прапановы моладзі не толькі па мерапрыемствах, але і па напаўненні і змяненні заканадаўства. Сёння працуе Канстытуцыйная камісія, і нам таксама будзе вельмі важна пачуць, што моладзь лічыць неабходным у змяненні тых нормаў, догмаў і, самае галоўнае, правілаў, па якіх будзе жыць і развівацца наша грамадства», — адзначыла старшыня БСЖ.

Член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ дадала, што творчы патэнцыял моладзі і жанчын — вельмі сур'ёзны сплаў, які можа быць паспяховы ў вырашэнні важных праблем.

«Наогул, грамадзянская ініцыятыва — найважнейшы рэсурс для ўстойлівага развіцця дэмакратычнага грамадства, а кансалідацыя канструктыўных сіл — магістральны напрамак развіцця дэмакратычных інстытутаў. Мэта нашага мерапрыемства — распрацаваць выразныя, зразумелыя, канкрэтныя праекты», — падкрэсліла яна.

Дэпутат выказала надзею, што згаданыя кірункі і алгарытмы ўзаемадзеяння будуць паспяхова рэалізаваны іншымі прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Канстытуцыйная рэформа

Што прапануюць змяніць у выбарчай сістэме?

Учора адбылося чарговае пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі, на якім былі разгледжаны магчымыя змяненні ў раздзел Канстытуцыі, што рэгламентуе выбарчую сістэму.

Старшыня Канстытуцыйнага суда, старшыня Канстытуцыйнай камісіі Пётр МІКЛАШЭВІЧ пазначыў асноўныя моманты меркаваных змяненняў. Гаворка ідзе, у прыватнасці, аб тым, каб замацаваць у Асноўным Законе канстытуцыйны статус Цэнтральнай выбарчай камісіі, «вызначыўшы, што гэта орган незалежны, фарміруецца на парытэтнай аснове, каб быў адпаведны давер ад грамадзян, выбаршчыкаў і ўсіх удзельнікаў выбарчага працэсу пры падвядзенні вынікаў і ў самім працэсе галасавання, правядзення іншых выбарчых працэдур».

Аб'ектыўныя рэаліі грамадска-палітычнага развіцця ў краіне паказваюць неабходнасць адмовы ад вылучэння кандыдатаў у дэпутаты працоўнымі калектывамі. «Трэба вызначыцца, што гэтым правам валодаюць палітычныя партыі, і на канстытуцыйным узроўні замацаваць пэўныя прынцыпы ў выбарчым працэсе», — падкрэсліў Пётр Міклашэвіч. Ён таксама нагадаў, што ў працэдуры збору подпісаў у падтрымку таго ці іншага кандыдата могуць удзельнічаць і грамадзяне.

«Неабходна зняць некаторыя абмежаванні для асоб, якія знаходзяцца пад вартай да суда, паколькі дзейнічае прэзумпцыя невінаватасці. Асоба да суда лічыцца невінаватай, толькі суд прыгаворам можа ўстанавіць яе вінаватасць і невінаватасць. Адпаведна, паступіў шэраг іншых прапаноў, якія будуць аналізавацца, даследавацца і рэдакцыйнай групай прапрацоўваца магчымыя змяненні», — расказаў старшыня камісіі.

Намеснік старшыні Канстытуцыйнага суда, член Канстытуцыйнай камісіі Наталля КАРПОВІЧ расказала, што ад грамадзян паступіла больш за 300 прапаноў па змяненні выбарчай сістэмы. У прыватнасці, паступілі прапановы аб мэтазгоднасці змянення ўзроставых цэнзаў грамадзян, увядзення грамадзянства ўзросту для ўдзелу ў выбарах і займання выбарных пасад, каб выбаршчык больш свядома прымаў сваё палітычнае рашэнне. «Таксама ўносіліся прапановы, якія датычацца выключэння некаторых абмежаванняў, прадугледжаных у Канстытуцыі для асоб, якія падазраюцца ў здзяйсненні злачынстваў. Таксама размова ішла аб змякчэнні абмежаванняў адносна асоб, якія прызнаныя судом недзеяздольнымі, — каб права абіраць і быць абраным абмяжоўвалася толькі для тых недзеяздольных, якія ў сілу свайго псіхічнага стану не могуць прыняць адпаведнага рашэння», — адзначыла Наталля Карповіч.

Акрамя таго, грамадзяне звярталі ўвагу на неабходнасць развіцця ў палажэннях Канстытуцыі ўдзелу розных формаў сацыяльнага прадстаўніцтва. Найперш размова ідзе аб палітычных партыях. У гэтай частцы ўносіліся часам нават проста супрацьлеглыя прапановы. Шэраг грамадзян прапануе захаваць мажарытарную выбарчую сістэму, пры якой усе дэпутаты абіраюцца народам і кожны выбаршчык галасуе за канкрэтнага кандыдата. Іншыя прапануюць увесці ў выбарчую сістэму элементы прапарцыянальнасці, г. зн. прадстаўніцтва палітычных партый.

Наступны блок прапаноў датычыўся змяненняў у раздзеле Канстытуцыі аб правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. Асноўныя з іх — пашырыць кола суб'ектаў, якія могуць ініцыяваць рэферэндум, удакладніць юрыдычную сілу рэферэндуму, рашэнняў, якія прымаюцца на ім. «І істотная прапанова датычыцца магчымасці папярэдняй праверкі пытанняў, якія выносяцца на рэспубліканскія рэферэндумы: паколькі гэта пэўныя арганізацыйныя намаганні і фінансавыя выдаткі, грамадзяне прапануюць ускласці, напрыклад, на Канстытуцыйны суд ці іншы дзяржаўны орган паўнамоцтвы праверкі, вынясення заключэння альбо рашэння аб мэтазгоднасці пастаноўкі пытання на рэферэндуме ў дадзенай форме», — дадала Наталля Карповіч.

Паводле яе слоў, усе прапановы грамадзян будуць вывучаны Канстытуцыйнай камісіяй з улікам практыкі, міжнародных падыходаў, асаблівасцяў развіцця нашай краіны.

Паводле БелТА.

Рынак працы

Калі эфектыўная дапамога — працаўладкаванне

У першыя тры месяцы 2021 года па садзейнічанне ў працаўладкаванні звярнулася 30 тыс. чалавек, з якіх 16,9 тыс. пастаўлены на ўлік у якасці беспрацоўных. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

У рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Рынак працы і садзейнічанне занятасці» на 2021—2025 гады ў студзені — сакавіку 20,7 тыс. чалавек працаўладкавана на пастаяннае месца, 1,1 тыс. накіраваны на навучанне па прафесіях, запатрабаваных на рынку працы, 6,5 тыс. чалавек прынялі ўдзел у аплачваных грамадскіх работах, 22 сям'і беспрацоўных пераселены на новае месца жыхарства і працы.

На 1 красавіка 2021 года на ўліку ў якасці беспрацоўных знаходзілася 8,6 тыс. чалавек, што на 13,9 % менш, чым на 1 красавіка 2020 года.

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на 1 красавіка 2021 года склаў 0,2 працэнта і ў параўнанні з 1 красавіка 2020 года (0,2 працэнта) не змяніўся.

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях склаў 0,3 працэнта, Гомельскай і Мінскай абласцях — 0,2 працэнта, г. Мінску — 0,1 працэнта.

Наймальнікамі на 1 красавіка 2021 года заяўлены звесткі аб наяўнасці 74,3 тыс. свабодных працоўных месцаў, што на 13,2 працэнта менш, чым на 1 красавіка 2020 года.

Попыт на работнікаў па рабочых прафесіях склаў 61,6 працэнта ад агульнай колькасці вакансій (на 1 красавіка 2020 года — 62,4 працэнта).

Пры гэтым у Мінску на аднаго беспрацоўнага прыходзіцца 19 вакансій, у Мінскай вобласці — 13,7, Гомельскай — 8,8, Гродзенскай — 8,7, Магілёўскай — 5,7, Брэсцкай — 5,5, Віцебскай вобласці — 5 вакансій.

Беспрацоўным лічыцца працаздольны грамадзянін, які не мае працы і заробку і зарэгістраваны ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленні (аддзеле) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта ў мэтах пошуку працы, шукае працу і гатовы прыступіць да яе.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Бруклін-Сэнтэр падчас пратэстаў затрымалі больш за 60 чалавек

Паліцыя Бруклін-Сэнтэр (штат Мінесота) затрымала больш за 60 удзельнікаў акцый пратэсту, якія на працягу некалькіх дзён праходзяць у гэтым горадзе пасля забойства там у нядзелю паліцэйскімі мясцовага цёмнаскурага жыхара Дантэ Райта. На прэс-канферэнцыі прадстаўнік паліцыі штата Мэт Лангер назваў дзеянні пратэстоўцаў «непрымальнымі» і папярэдзіў аб адказнасці тых, хто парушае правапарадак і злоўжывае правам на мірныя мітынгі. Паводле яго слоў, многія з узятых пад варту былі затрыманыя за «пагромы і іншыя злачынныя дзеянні». Памочнік камісара паліцыі Мінесоты па сувязях з грамадскасцю Букер Ходжэс звярнуў увагу на тое, што характар пратэстаў у Бруклін-Сэнтэр прыкметна змяніўся да горшага, як і склад удзельнікаў гэтых акцый. У розных частках горада здзяйсняліся акты вандалізму і налёты на мясцовыя крамы.

САЗ заклікала спыніць гандаль дзікімі жывёламі на рынках

Эксперты адзначылі, што «жывёлы, асабліва дзікія, могуць быць крыніцай больш чым 70 працэнтаў усіх успышак інфекцыйных захворванняў у людзей», многія з якіх звязаныя з невядомымі дагэтуль вірусамі. Раней у гэтым годзе эксперты САЗ наведалі кітайскі горад Ухань з мэтай выяўлення крыніцы новага каранавіруса. Яны прыйшлі да высновы, што з вялікай доляй верагоднасці першапачаткова ковід цыркуляваў сярод кажаноў, але чалавеку перадаўся не непасрэдна ад іх, а праз прамежкавага носьбіта. Магчымай крыніцай інфекцыі маглі стаць замарожаныя прадукты, з якімі вірус мог трапіць на рынак ва Ухань, паведамілі спецыялісты арганізацыі.

Бананы апынуліся пад пагрозай знікнення

Чалавецтва можа застацца без бананаў з-за высокаінфекцыйнага глебавага грыбка, паведаміла Die Welt. Захворванне пад назвай Tropical Race 4 (TR4) пачало актыўна распаўсюджвацца ў Азіі і Аўстраліі ў XX стагоддзі, аднак у 2019-м яго ўпершыню выявілі ў Паўднёвай Амерыцы — асноўным сусветным рэгіёне-пастаўшчыку бананаў. Захворванне не паддаецца ўздзеянню хімікатаў, з-за чаго заражаныя глебы будуць выведзеныя з абароту як мінімум на 30-40 гадоў. Спецыялісты папярэджваюць, што нават невялікая часцінка заражанай глебы на падэшве ў фермера можа прывесці да распаўсюджвання інфекцыі. Акрамя таго, яны растлумачылі, што хвароба хутка распаўсюджваецца з-за перадачы раслінамі адзін аднаму адных і тых жа генаў.

Лесу паболела!

Міністэрства лясной гаспадаркі падвяло вынікі рэспубліканскай добраахвотнай акцыі «Тыдзень лесу — 2021». Нагадаем, сёлета яна адбылася ўжо ў 14-ы раз і была прымеркавана да Года народнага адзінства.

Усяго ў акцыі ўзяло ўдзел 58 778 чалавек, у 2020-м у акцыі паўдзельнічала крыху больш за 42 тысячы беларусаў. У асноўным добраахвотнікі займаліся пасадкай лесу. Усяго за сем дзён на плошчы 7150 гектараў было высаджана 33 188 814 дрэў.

У ходзе акцыі добраахвотнікі таксама займаліся прыборкай смецця (прыбрана 2 976,54 кубаметра), рыхтавалі месцы масавага адпачынку да летняга сезона (адрэстаўравана 139 аб'ектаў). У рамках «Тыдня лесу» па ўсёй краіне было закладзена некалькі дзясяткаў памятных алей.

У міністэрстве паведамілі, што сёлета найбольшая колькасць валанцёраў працавала ў Мінскай вобласці (13 150 чалавек), а вось у Гомельскай вобласці была акумулявана найбольшая колькасць лясных культур (каля 12 мільёнаў штук).

Падчас акцыі кожны добраахвотнік ва ўзросце да 18 гадоў атрымаў ад лесагаспадарчых установ невялікі сувенір, у хуткім часе лясгасы таксама заахвоцяць найбольш актыўныя ўстановы адукацыі, а Міністэрства лясной гаспадаркі абярэ пераможцаў конкурсу ў сацыяльных сетках. Нагадаем, валанцёрам прапануецца зняць крэатыўныя фота і відэа, размясціць іх у сацсетках з хэштэгамі акцыі. Да канца красавіка дзесяць аўтараў найбольш крэатыўных работ атрымаюць памятныя «лясныя» наборы ад арганізатараў акцыі.

Акцыя

Любіш паплаваць...

Традыцыйная веснавая акцыя «Чысты вадаём» пройдзе ў Беларусі 16—24 красавіка, паведамілі ў Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў, якое арганізоўвае мерапрыемства.

Яна скіравана на экалагічнае выхаванне насельніцтва, прыцягненне ўвагі да праблемы забруджвання вадаёмаў, а таксама на прывядзенне ў парадак прыбярэжнай зоны напярэдадні адкрыцця сезона масавага актыўнага адпачынку на прыродзе.

Паўдзельнічаць могуць усе ахвотныя. Для гэтага трэба звярнуцца ў раённыя ўстановы Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў па месцы жыхарства, дзе выдадуць усё неабходнае (смеццевыя пакеты, пальчаткі), а таксама дапамогуць з вывазам сабранага смецця. З інфармацыяй аб раённых арганізацыйных структурах, іх адрасамі і тэлефонамі можна азнаёміцца на сайце таварыства.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Будзь у курсе!

Нежаданы госць з Усходняй Азіі

Вучоныя з БДУ і БрДУ імя А. С. Пушкіна зафіксавалі распаўсюджванне нетыповага для Беларусі шкодніка дэкаратыўных раслін — самшытавай агнёўкі. Гэта матылёк сярэдніх памераў серабрыста-белага колеру з карычнева-чорнай аблямоўкай па краях крылаў. Небяспеку для раслін уяўляюць яго вусені, якія сілкуюцца маладымі лісцем і сцяблом самшыта вечназялёнага.

Упершыню казюрку знайшлі ў 2019 годзе ў Камянецкім раёне мясцовыя жыхары. У 2020 годзе Алег Сінчук (БДУ) і Аляксандр Колбас (БрДУ) выявілі агнёўку ў гарадскім парку Брэста і зафіксавалі яе распаўсюджванне па ўсёй тэрыторыі абласнога цэнтра. Беларускія даследчыкі лічаць, што сёлета пры захаванні цёплага надвор'я з мая да кастрычніка насякомае можа даць да трох пакаленняў. Гэта прывядзе да пашкоджання вялікай колькасці самшыта ў Беларусі і запатрабуе значнага павелічэння мерапрыемстваў па барацьбе з агнёўкай або поўнай адмовы ад выкарыстання дадзенай расліны пры азеляненні плошчаў.

На думку біёлагаў, шкоднік трапіў у Беларусь шляхам натуральнага перамяшчэння з Польшчы. Распаўсюджванне казюркі па Еўропе пачалося з 2006 года. Тады шкоднік быў знойдзены ў Германіі. А радзімай агнёўкі з'яўляецца Усходняя Азія. Папуляцыя насякомага характэрная ў першую чаргу для Кітая, Індыі, Японіі, Карэі і Далёкага Усходу Расіі. Колькасць агнёвак у гэтых краінах рэгулюецца натуральнымі ворагамі — энтамафагамі і паразітамі. З-за іх адсутнасці ў еўрапейскім рэгіёне, у тым ліку і ў Беларусі, наяўнасць агнёўкі вельмі небяспечная для самшыта.

На дадзеным этапе беларускія навукоўцы прапануюць змагацца з насякомым традыцыйнымі сродкамі па абароне раслін ад шкоднікаў. Апрацоўваць самшыт трэба на стадыі фарміравання вусеня. Кукалкі і матылі менш успрымальныя да прэпаратаў, таму дарослых асобін збіраюць уручную і знішчаюць. Здаровыя расліны не патрабуюць прафілактычнай засцярогі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фінансавая палітыка

СТАЎКУ РЭФІНАНСАВАННЯ ЗЛЁГКУ «АДПУСЦІЛІ»

У Нацбанку паведамілі, што з 21 красавіка яна павышаецца да 8,5 % гадавых

Усё так, з наступнай серады павышаецца стаўка рэфінансавання, а стаўка па крэдыце авернайт стане 9,5 % гадавых, стаўка па дэпазіце авернайт — 7,5 %. Гэтыя рашэнні прыняты Праўленнем Нацыянальнага банка краіны па выніках пасяджэння па грашова-крэдытнай палітыцы з улікам комплексу знешніх і ўнутраных фактараў, якія ўплываюць на бягучую і будучую дынаміку спажывецкіх цэн.

У прэс-службе рэгулятара адзначылі, што ў канцы мінулага года інфляцыйныя працэсы паскорыліся, што было абумоўлена пераносам у цэны аслаблення беларускага рубля, а таксама шокамі прапановы на рынках асобных харчовых тавараў. У пачатку гэтага года інфляцыя працягнула паскарацца пад уплывам далейшага павышэння сусветных цэн на харчовыя тавары, а таксама на імпартаваныя нехарчовыя тавары, кошт якіх для спажыўца павялічыўся з-за ўзрослых лагістычных выдаткаў і перабояў з пастаўкамі з прычыны пандэміі.

Дадатковы праінфляцыйны ўплыў на ўнутраным рынку краіны сфарміраваўся ў сувязі з адменай ільгот па падатку на дабаўленую вартасць.

Названыя фактары на фоне паскоранай інфляцыі і яе працяглага адхілення ад 5-працэнтнага ўзроўню прывялі да павышэння інфляцыйных чаканняў, што пацвярджаецца вынікамі апытання насельніцтва і маніторынгу прадпрыемстваў. Адпаведна, пашырыўся пералік тавараў і паслуг спажывецкага кошыка, цэны на якія сталі расці больш высокімі тэмпамі. Па выніках сакавіка 2021 года, прырост спажывецкіх цэн склаў 8,5 % у гадавым выражэнні.

Таму для абмежавання інфляцыі Нацыянальным банкам прыняты комплекс мер, накіраваных на ўзмацненне кантролю за грашовай прапановай. У сусветнай эканоміцы ў найбліжэйшай перспектыве чакаецца павышаны інфляцыйны фон, што абумоўлена правядзеннем шэрагам развітых краін стымулюючай грашова-крэдытнай палітыкі.

Адначасова больш значны можа быць уплыў на інфляцыю ў Беларусі шокаў харчовых цэн, а таксама наступстваў пандэміі ў частцы павышэння цэн імпартных нехарчовых тавараў.

У сукупнасці названыя фактары фарміруюць перадумовы для захавання павышаных інфляцыйных чаканняў эканамічных агентаў працяглы час, што ўзмацняе рызыкі захавання павышанай інфляцыі ў будучыні. У той жа час слабы спажывецкі і інвестыцыйны попыт унутры краіны будуць крыху абмяжоўваць інфляцыю.

З мэтай абмежавання праінфляцыйных рызык і ўзмацнення мер у галіне кантролю над грашовай прапановай Праўленнем Нацыянальнага банка прынята рашэнне аб павышэнні стаўкі рэфінансавання. З улікам уплыву ўсіх фактараў, пачынаючы ўжо з II квартала гэтага года, прагназуецца зніжэнне квартальных тэмпаў росту спажывецкіх цэн. Разам з тым тое, што адбылося раней, будзе адлюстроўвацца ў гадавой інфляцыі да канца бягучага года. Чакаецца, што гадавы тэмп росту цэн павялічыцца ў II квартале ў параўнанні з бягучым значэннем і затым знізіцца да канца гэтага года. У снежні 2021 года прырост спажывецкіх цэн прагназуецца каля 7 %. У далейшым гадавая інфляцыя працягне запавольвацца і з II квартала наступнага года ацэньваецца на ўзроўні сярэднетэрміновага мэтавага арыенціра — блізу 5 %.

Упраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка ўдакладняе, што пры разглядзе пытанняў па грашова-крэдытнай палітыцы Праўленне галоўнага банка паранейшаму будзе зыходзіць з неабходнасці падтрымання цанавой стабільнасці.

САМЫЯ ВЯЛІКІЯ ПРАЦЭНТЫ — У РУБЛЁВЫХ ДЭПАЗІТАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён параіў інвестарам асноўную частку сваіх укладанняў трымаць у доларах у найбліжэйшай перспектыве. Акрамя таго, па словах эксперта, у шэрагу валют ёсць і так званыя нярыначныя рызыкі, якія варта ўлічваць: напрыклад, расійскі рубель недаацэнены ў адносінах да долара, паколькі «знаходзіцца пад ціскам геапалітычных пагроз», адзначыў Бабін.

Ад сябе асабіста я дадаў бы, што калі вы не збіраецеся за мяжу, тады трэба выбіраць валюту для інвестыцый, дзе самая маленькая маржа (розніца паміж купляй і продажам банкнотаў). У нашых беларускіх рэаліях гэта якраз долар. Але не варта забываць, што самыя вялікія працэнты па ўкладах прысутнічаюць менавіта ў рублёвых дэпазітах. І яшчэ нагадаю, што курс долара нязменна стаяў на адным месцы на працягу амаль двух з паловай гадоў, аж да лета мінулага года. Потым яго «сарвала». Можа, хопіць ужо «амерыканцу» расці?

Лепш усё-ткі безадзыўны...

Укады дзеляцца на дзве асноўныя катэгорыі — адзыўныя і безадзыўныя. Адзыўны дэпазіт афармляецца на пэўны тэрмін, але пры жаданні вы можаце ў любы момант забраць свае грошы — цалкам або часткова. Ужо за саму магчымасць у любы час пакарыстацца сваімі грашыма кліент банка расплачваецца паніжанымі працэнтамі.

Што датычыцца падаткаў, то з рублём мы маем невялікае паслабленне. Падаходны падатак (13 %) будзе ўтрымлівацца з даходаў, атрыманых у беларускіх рублях, — тэрмінам меншым за 1 год. Паляжалі вашы кроўныя рублі на рахунках год і адзін дзень — усё, ніякіх падаткаў з працэнтаў плаціць не трэба.

Самы выгадны адзыўны дэпазіт па долары тэрмінам ад 35 дзён да 13 месяцаў прадугледжвае ўсяго толькі 0,75 % гадавых. Даходнасць укладаў у еўра ў залежнасці ад укладу — 0,1-0,5 %. Адзыўныя ўклады можна папаўняць на працягу ўсяго тэрміну захоўвання.

Акрамя таго, як вы здымаеце грошы датэрмінова, працэнты налічваюцца і выплачваюцца за фактычны час захоўвання сродкаў па стаўцы, ніжэйшай за асноўную. Зараз умовы датэрміновага скасавання вельмі жорсткія. Дапусцім, ваш дэпазіт на пяць месяцаў, а грошы вы забралі ўжо праз месяц. У гэтым выпадку вам налічаць за ўсё 0,1 або 0,2 працэнта даходу. Прыкладна такая ж тэхналогія падліку працэнтаў і па рублёвых адзыўных дэпазітах, толькі першапачаткова стаўкі там вышэйшыя.

Безадзыўныя ўклады, наадварот, чакаюць свайго часу. Вы ўносіце грошы на дэпазіт і

забіраеце іх толькі па заканчэнні таго тэрміну, які паказаны ў дагаворы. Сітуацыі бываюць розныя, і ў форс-мажорных абставінах банк можа пайсці вам насустрач і датэрмінова вярнуць грошы, але для гэтага патрэбныя важкія падставы. Стаўкі па безадзыўных дэпазітах заўсёды прывабнейшыя і вышэйшыя.

Максімальная стаўка на безадзыўныя ўклады на адзін год цяпер роўная 2,3 % гадавых. Праўда, у сярэдзіне сакавіка часова (два тыдні) праіснавала новая прапанова ад Белгазпрамбанка — уклад на 13 месяцаў пад 2,4 % у доларах і 1,75 % у еўра. Максімальная стаўка ў іншых банках — 2,3 %, па ўкладах у еўра —1,3 %.

І яшчэ. Валютныя ўклады тэрмінам да двух гадоў абкладаюцца падаходным падаткам у 13 %. Напрыклад, «чыстая» стаўка па ўкладзе пад 2,3 % на 13 месяцаў будзе прыкладна роўная 2 % гадавых.

Дагаворы анлайн і на вялікія першапачатковыя сумы — у рублях

Беларускія банкі цяпер з задавальненнем бяруць любыя сумы рублёў на любы час. Галоўнае, каб укады былі безадзыўныя. Сярэднія працэнты па дэпазітах на тэрмін ад 180 дзён да 24 месяцаў пачынаюцца ад 16 % да 17,5 %. Праўда, ёсць укады, дзе працэнты дасягаюць 19 % і 19,1 %. У першым выпадку гэта ўклад, дзе мінімальная сума пачынаецца з 5000 рублёў, у другім — дагавор лічыцца заключаным без фізічнай прысутнасці кліента ў банку, у рэжыме анлайн. Каб прыцягнуць кліентаў, банкі сёння прапануюць нядрэнныя працэнты на безадзыўныя ўклады нават на кароткія тэрміны. Стаўкі памерам 12,6 % — 14 % гадавых цяпер можна знайсці на дэпазіце на тэрмін 35, 65 і 95 дзён.

Таксама трэба памятаць, што стаўка фіксаваная, але ёсць нюансы... Большасць дэпазітаў, асабліва з невялікімі тэрмінамі, мае пастаянную працэнтную стаўку, якая самастойна банкамі мяняцца не можа. Наогул, банкі цяпер не могуць памяншаць стаўкі па дэпазітах у аднабаковым парадку. Гэта стала правілам, якое зафіксаваў рэгулятар раней. З названага правіла маецца выключэнне: дагаворы са зменнай стаўкай, што залежыць ад паказчыка, змяненне якога адбываецца незалежна ад банка. У прыватнасці, такім параметрам можа быць стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка. Таму некаторыя банкі, апісваючы стаўку на працяглыя тэрміны, адзначаюць, што яна роўная стаўцы рэфінансавання плюс-мінус нейкі працэнт.

Акрамя таго, банкі пазбавіліся магчымасці зарабляць сродкі яшчэ некалькімі спосабамі, якія ў Нацыянальным банку палічылі непрымальнымі. У прыватнасці, ім забаронена браць грошы за інфармацыю аб умовах крэдытавання і разгляд заявы аб выдачы крэдыту, а таксама за адкрыццё банкаўскага рахунку і залічэнне на яго крэдыту.

Што датычыцца падаткаў, то з рублём мы маем невялікае паслабленне. Падаходны падатак (13 %) будзе ўтрымлівацца з даходаў, атрыманых у беларускіх рублях, — тэрмінам меншым за 1 год. Паляжалі вашы кроўныя рублі на рахунках год і адзін дзень — усё, ніякіх падаткаў з працэнтаў плаціць не трэба.

Некаторыя валютныя дагаворы трэба будзе рэгістраваць

У нашай краіне з 9 ліпеня ўводзяць абавязковую рэгістрацыю некаторых валютных дагавораў. Гэта патрабаванне закране ў тым ліку здзелкі па куплі нерухомасці, каштоўных папер, экспартных і імпартных кантрактаў. Але адразу ўдакладнім, што гэта патрабаванне закране не ўсе валютныя дагаворы, а толькі тыя, якія будуць заключаны з нерэзідэнтамі (замежнікамі, замежнымі кампаніямі, арганізацыямі) і перавысяць устаноўленую мяжу. Напрыклад, калі прадаць кватэру расіяніну або ўкраінцу і сума здзелкі перавысіць уведзены ліміт, то прыйдзецца зарэгістраваць дагавор, а калі нерухомасць у вас набудзе жыхар нашай краіны — даваць справаздачу ў Нацбанк аб гэтым не трэба.

Менавіта з ліпеня запрацуе новая рэдакцыя закона «Аб валютным рэгуляванні і кантролі». Сярод іншага, Нацыянальны банк дазволіць адкрываць рахункі ў замежных банках, купляць акцыі і нерухомасць за мяжой без узгаднення з ім.

Дзве ўмовы рэгістрацыі валютнага дагавора

Першая важная ўмова для рэгістрацыі такога дагавора — ён павінен быць заключаны рэзідэнтам з нерэзідэнтам (фізічнай асобай — замежнікам ці замежнай юрыдычнай асобай (кампаніяй, арганізацыяй). Другая ўмова — рэгістраваць валютны дагавор трэба, калі сума па дагаворы перавышае 2000 базавых велічынь для фізічных асоб — цяпер гэта 58 тысяч рублёў, а для юрыдычных асоб і ІП — 4000 базавых (116 тысяч рублёў). Рэгістраваць дагаворы трэба таксама ў тых выпадках, калі сума ў дагаворы не вызначана.

Валютны дагавор падлягае рэгістрацыі, напрыклад, пры продажы кватэры або дома, які знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, нерэзідэнту. Гэта значыць, калі ў вас захоча купіць нерухомасць расіянін і сума здзелкі перавысіць устаноўленую мяжу, то трэба будзе зарэгістраваць дагавор. Калі беларус набудзе ў Расіі, ва Украіне ці іншай дзяржаве ў нерэзідэнта нашай краіны нерухомасць і сума здзелкі перавысіць мяжу па суме, таксама прыйдзецца зарэгістраваць дагавор.

Спіс дагавораў, якія трэба рэгістраваць, салідны. Сярод іншага, гэта выдзяленне рэзідэнтам грошай нерэзідэнту на бязвыплатнай аснове або дарэнне. Прасцей кажучы, калі беларус падорыць або бязвыплатна перадасць замежніку больш за 2000 базавых велічынь (калі гаворка ідзе пра фізічную асобу), то гэта трэба зарэгістраваць. Калі беларус захоча ўкласціся ў статутны фонд кампаніі-нерэзідэнта, трэба будзе таксама даць справаздачу перад Нацбанкам.

Найлепшай валютай для зберажэнняў гэтай вясной стане долар, расказаў эксперт па фондавым рынку адной маскоўскай інвестыцыйнай кампаніі Дзмітрый Бабін. Па словах фінансіста, валюты, якія былі фаварытамі летась, паступова ператвараюцца ў аўтсайдараў, хоць даражэлі апошнія 9 месяцаў.

Дагавор неабходна зарэгістраваць да таго, як рэзідэнт здзейсніць якія-небудзь дзеянні па яго выкананні альбо не пазней за 7 рабочых дзён з даты, якая ідзе за днём паступлення грошай на рахунак рэзідэнта, у тым ліку ў замежным банку.

Зарэгістраваць дагавор трэба будзе на спецыяльным вэб-партале Нацбанка. Там ёсць асобныя ўваходы ў сістэмы для фізічных асоб, юрыдычных асоб і ІП. Дарэчы, на партал трэба будзе падаць інфармацыю таксама пра валютныя дагаворы, заключаныя рэзідэнтамі да 9 ліпеня 2021 года, калі абавязацельствы па іх будуць нявыкананыя да гэтага часу.

На партале ўжо можна паглядзець інструкцыю рэзідэнта па падачы інфармацыі. Так, для юрыдычных асоб, сярод іншага, пры рэгістрацыі трэба будзе паказваць тэрміны дагавора, у якой валюце, абслуговы банк, парадак разліку, прымацаваць сам дагавор і іншае.

Абноўленай у сакавіку рэдакцыяй КаАП увялі адміністрацыйныя правапарушэнні, якія датычацца валютных дагавораў, і адказнасць за іх здзяйсненне. Сярод іх — нерэгістрацыя валютнага дагавора. За невыкананне абавязку па рэгістрацыі валютнага дагавора, калі гэта патрабуецца па законе, фізасобы могуць атрымаць штраф да 5 базавых велічынь (да 145 рублёў), а юрыдычныя асобы і ІП — да 10 базавых (да 290 рублёў).

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

Сямейная газета

Выпуск № 7 (166)

СУПЕРмаці

Гартаю стужку свайго «Інстаграма» ў інтэрнэце і прыходжу да высновы, што сярод маіх віртуальных сябровак — амаль адны супермаці. Здаецца, яны без праблем выхоўваюць дзяцей, паспяхова рэалізоўваюць свае амбіцыі на рабоце, ствараюць утульную абстаноўку ў доме, гатуюць не горш, чым у рэстаране, знаходзяць час на тое, каб быць прыгожымі, і нават паспяваюць адпачыць. Ім можна толькі пазайздросціць, а лепш — у іх павучыцца, як, нягледзячы на жаноцкі і мацярынскі клопат, атрымліваць асалоду ад жыцця.

Дзіяна — сапраўдная бізнесвумен. Яна знаходзіцца ў дэкрэце, але добра ведае, як зарабляць грошы дыстанцыйна. Таксама маці двух дзетак вядзе папулярны блог, у якім прапагандуе здаровы спосаб жыцця, дзеліцца ўласнымі сакрэтамі прыгажосці. Яна шмат расказвае пра сваю сям'ю, паказвае, чым займаюцца яе дзеці, што яны ядуць, апранаюць. Пасля прагляду фотаздымкаў і відэагісторый усплывае карцінка шчаслівай, паспяховай сям'і, дзе пануюць цеплыня, згода і ўзаемаразуменне.

У адрозненне ад Дзіяны, Ганна выхоўвае сваю дачушку адна. Аднак адсутнасць мужа ніколькі не псуе яе вобраз супермаці. Акрамя таго, што Ганна шмат часу аддае прафесіі (дзяўчына — ваенны журналіст), яна піша кнігі, якія паспяхова выдаюцца і збіраюць падчас прэзентацый немалую аўдыторыю. Журналістка таксама выступае за здаровы спосаб жыцця: на яе старонцы шмат фота- і відэасюжэтаў з танцавальнай школы і трэнажорнай залы, дзе маладая маці даводзіць да ладу і без таго добрую фігуру. Не забываецца Ганна і пра дачку: пацешна паглядзець, як яны з малой пякуць блінцы, робяць генеральную прыборку ў кватэры, складаюць мазаіку, малююць, чытаюць дзіцячую літаратуру.

Таня, маці Ромкі, — адна з найбольш запатрабаваных мінскіх цырульніц. Каб запісацца да яе на прычоску, трэба патэлефанаваць за паўгода, а можа, нават і раней. Амаль усе нявесты сталіцы хочуць, каб у самы важны для дзяўчат дзень менавіта яна рабіла іх прыгожымі. Іншыя ж, хто таксама мае дачыненне да гэтай сферы, хочуць, каб яна навучыла іх цырульніцкаму майстэрству — невыпадкова Таня адкрыла яшчэ і курсы павышэння кваліфікацыі. Калі яна займаецца сваім сынам? Гэта застаецца па-за кадрам, але на рэдкіх фотаздымках малы выглядае дагледжаным, не абдзеленым цацкамі і ўвагай бацькоў — адным словам, шчаслівым дзіцем.

У Лены, здаецца, часу хапае на ўсё. Кожны дзень маладая маці наводзіць у кватэры парадак, бо яе дзесяцімесячны сынок — алергік, корміць мужа шыкоўнымі і, напэўна, вельмі смачнымі стравамі. Нягледзячы на тое, што Максім — грудны, не забываецца і пра сябе: робіць манікюр, часта наводзіць марафет у цырульніка, удасканальвае фігуру ў спартыўнай зале. Разам з малым яны з мужам ходзяць у крамы, ездзяць у госці, кожныя выхадныя наведваюць у вёсцы бацькоў, бавяць час у дзіцячых забаўляльных цэнтрах.

«Сучасная маці павінна паспяваць усё», — скажаце вы і будзеце мець радыю. Як, напрыклад, Надзея, маці Сымонкі. Пайшла ў дэкрэтны водпуск, набыла хату ў вёсцы, куды, нарадзіўшы, і з'ехала разам са сваімі мужчынамі — вялікім і малым. Самі сабе сужэнцы стварылі прыдатныя ўмовы, бо без выгод, самі ведаеце, як гадаваць дзяцей, і цяпер атрымліваюць асалоду ад сельскага жыцця. Разам з мужам Надзя садзіць агарод, эксперыментуе з насеннем, расадай — і потым дзеліцца шыкоўнымі фотаздымкамі сабранага ўраджаю. А яшчэ яна пячэ хлеб — сапраўдны, духмяны, са скарыначкай. Прызнаецца, што ўвогуле ніякіх булак ды печыва ў краме ўжо даўно не набывае: усё пячэ сама. Не здзіўлюся, калі неўзабаве на яе падворку з'явіцца не толькі кветкі ды кампоставая яма, якую яе муж-рамеснік зрабіў уласнымі рукамі, а будуць бегаць яшчэ курачкі ды козачкі — сваё малако вам не крамнае!

Марына ўвогуле здзіўляе сваёй смеласцю і рашучасцю. Калі мой Цёмік быў у такім узросце, як яе Міша, я нават думаць не магла, каб хадзіць з ім па крамах, займацца абслугоўваннем свайго аўтамабіля, а тым больш ляцець з немаўлём на мора — без мужа, але са старэйшай дачкой, з якой таксама пакуль вачэй не спусціш. Пяцімесячны хлопчык падарожнічае з мамай паўсюль, і Марына ніколькі не тлуміць галаву, як яго пакарміць (існуе спецыяльнае адзенне для кормячых маці), дзе ў выпадку непрыемнасці пераапрануць, і няважна, што малы паспіць не ў сваім утульным ложачку. Больш за тое, разам з дзецьмі яна плануе пераезд у іншую краіну, дзе мужу прапанавалі неблагі кантракт.

Адным словам, ці час цяпер такі — быць супермамамі, ці вырасла іншае пакаленне жанчын, якія прызвычаіліся суіснаваць у вірлівым рытме разам са сваімі дзецьмі. Рэдка хто цяпер з нараджэннем малых мяняе свой звыклы ўклад жыцця: наадварот, дзеці робяць сваіх матуль яшчэ больш сучаснымі, мабільнымі, прыгожымі — каравцей, супермамамі.

Вераніка КАНЮТА.

Тыя, хто побач

Салістка беларускай оперы Іна РУСІНОЎСКАЯ:

«ДОБРА, КАЛІ З СЯБРОЎСТВА НАРАДЖАЕЦЦА КАХАННЕ»



Салістка Вялікага тэатра Беларусі Іна Русіноўская і яе муж Міхаіл — артыст хору гэтага ж тэатра — у мінулым годзе адзначылі фарфоравае вяселле. Іх віншавалі сябры юнацтва, якія ў свой час казалі: «Прыгледзьцеся, вы падыходзіце адно аднаму». І не памыліліся.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

Бацькі і дзеці

АДКУЛЬ Я ЎЗЯЎСЯ, або Як адказаць, каб не пакрыўдзіць

Падобнае пытанне дзіцяці часта напаткае бацькоў, калі яны менш за ўсё гэтага чакаюць. І раней лічылася, што адказаць на яго ў стылі «мы цябе знайшлі ў капусце», «купілі ў краме» ці «бусел прынёс» — гэта выйсце. Цяпер жа дарослыя нават у сацсетках абмяркоўваюць, як прасвятліць дзіця, не нашкодзіўшы яму.

Варта разумець, што прыдумваючы рознага кшталту фантастычныя гісторыі па гэтай тэме, мы падводзім дзяцей да сітуацыі, калі шукаць патрэбныя адказы яны будуць вымушаны на вуліцы альбо, як зараз папулярна, у інтэрнэце.

— Асноўнае правіла ў гэтай тэме — гаварыць, калі пытаюцца. Ініцыіраваць самім такую размову не варта. Аднак нейкую агульную інфармацыю пра палавое выхаванне трэба пачынаць абмяркоўваць з дзяцінства, таму што гэта той перыяд, калі дзіця дае бацькам і яны для яго з'яўляюцца аўтарытэтам. Такая размова — своеасаблівая падрыхтоўка да больш важных і сур'ёзных дыялогаў, сярод якіх і тэма з'яўлення на свет, — кажа **псіхолаг Вера ПРОХАРЧЫК.** — Можна распавядаць пра фізіялогію, будову цела, адрозненні мужчыны ад жанчыны. Але без памяншальна-ласкальных назваў, называйце ўсё як ёсць. У далейшым гэта дапаможа дзіцяці свабодна задаваць тыя пытанні, якія ў яго ўзнікнуць з узростам. Самае важнае — памятаць, што дзіцем кіруе цікавасць. А нейкі сорам яно можа адчуць толькі ў тым выпадку, калі мама ці тата так да гэтага ставіцца. Не варта баяцца, што калі гаварыць з дзецьмі на тэму зараджэння новага жыцця, то гэта падагрэе дзіцячую цікаўнасць. У тым жа дашкольным узросце сын ці дачка, атрымаўшы адказ на сваё пытанне, далей, як правіла, не паглыбляецца. Варта задаволіць інтарэс малечы, і тэма закрыецца.

(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)

Разам

Інклюзія праз вучобу і спорт

Прасоўванне і ўмацаванне інклюзіўнага падыходу ў сферы адукацыі, павышэнне дасведчанасці беларусаў аб здольнасцях дзяцей з парушэннямі інтэлекту, развіццё і ўмацаванне валанцёрскага руху ў сферы работы з дзецьмі з інваліднасцю — такія мэты ставіць перад сабой Мемарандум аб супрацоўніцтве, які на карысць развіцця і міру падпісалі днямі Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) і грамадскае аб'яднанне «Беларускі камітэт «Спешыал Алімпікс».

ЮНІСЕФ супрацоўнічае са «Спешыал Алімпікс» з 2016 года. Разам гэтыя арганізацыі імкнуцца ствараць роўныя магчымасці для дзяцей, развіваць інклюзію. «Кожны з нас вядзе работу па змяншэнні дыстанцыі паміж грамадствам і дзецьмі з інтэлектуальнымі парушэннямі, умеў выбудоўваць сяброўскі дыялог цярпліва і з разуменнем, не пазбягаючы такіх зносін», лічаць у «Спешыал Алімпікс».

У Беларусі на 2018 год зарэгістравана 76 345 дзяцей да 17 гадоў, якія маюць псіхічныя расстройствы і парушэнні паводзін, прычым 21 328 непаўналетнім такія дыягназы былі пастаўлены ўпершыню. А ў 2019-м 783 дзіцяці ўпершыню былі прызнаныя інвалідамі па класе псіхічных расстройстваў і парушэнняў паводзін.

Іх паўнавартасная інтэграцыя ў вучобу і спорт ускладняецца няўпэўненасцю навакольных у сваіх магчымасцях і ведах пра ўцягванне дзіцяці з інваліднасцю ў штодзённыя кантакты. Тым не менш, наладзіць сяброўскія і камфортныя адносіны з непаўналетнімі, якія маюць ментальныя парушэнні, не так і складана, упэўнены ў ЮНІСЕФ.

Адным з першых мерапрыемстваў у межах новага партнёрства, якое адбылося адразу пасля падпісання мемарандума, стала лекцыя па камунікацыі з такімі дзецьмі. Эксперты расказалі, як правільна паводзіць сябе з непаўналетнімі, якія маюць ментальныя парушэнні, і далі некалькі простых парад. Падчас зносін захоўвайце ціхі і спакойны тон. Не парадзіруйце вымаўленне слоў, спадзеючыся, што так чалавек зможа лепш вас зразумець. Захоўвайце зрокавы кантакт. Будзьце зацікаўленыя ў размове і праяўляйце павагу да суразмоўніка з парушэннямі.

Ірына СІДАРОК.

ПЕРАМОГА ЖЫЦЦЯ НАД СМЕРЦЮ

Які глыбінны сэнс змяшчае фраза «Хрыстос уваскрос!»

Штогод у тысячах храмаў па ўсім свеце раздаецца звон, абвяшчаючы аб Уваскрэсенні Хрыстовым. Вялікдзень для хрысціян — сімвал і сведчанне перамогі жыцця над смерцю. У гэтым годзе праваслаўныя святкуюць яго 2 мая.

Вялікдзень — галоўнае свята ў царкоўным календары. Кожны год яно прыходзіць у розны час: дата яго святкавання не мае дакладна ўстаноўленага дня. Згодна з царкоўным канонам, Уваскрэсенне Хрыстова спраўляюць вясной у першую нядзелю пасля поўні, якая надыходзіць услед за вясновым раўнадзенствам. І, згодна з канонам, 40 дзён з Вялікадня вернікі вітаюць адзін аднаго словамі: «Хрыстос уваскрос!» — «Сапраўды ўваскрос!»

— Свята са святаў і ўрачыстасць з урачыстасцяў — так кажуць пра Вялікдзень, — распавядае настаяцель прыхода храма Свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску, святар Аляксандр (Пальчэўскі).

ДЗЕНЬ ВЯЛІКАЙ РАДАСЦІ

Сакральны сэнс свята Вялікадня нязменны з часоў апосталаў: Сын Божы добраахвотна пайшоў на крыж і, прыняўшы смерць, уваскрос, пазбавіўшы людзей ад граху.

«Куліч звязаны з богаслужбовай традыцыяй — з артасам, святым хлебам, які выпякаецца ў царкве да Вялікадня і раздаецца вернікам. Артас — частка велікоднага богаслужэння».

— «Пасха» — грэчаскае слова, яно паходзіць ад старажытнаяўрэйскай назвы свята «песах», — распавядае святар. — Гэтае свята існавала яшчэ ў дахрысціянскія часы. Стары Запавет апісвае вызваленне яўрэяў з егіпецкага палону, і ў гонар гэтай падзеі яўрэі ўпершыню здзейснілі свята Пасхі. Само ж слова «песах» перакладаецца як «праходжанне міма». У Святым Пісанні сказана, што фараон не хацеў адпускаць яўрэйскі народ, і ў пакаранне Гасподзь наслаў на прыгнятальнікаў кары егіпецкія. І апошняе няшчасце, якое абрынулася на егіпцян, было такім: кожнае першае ў сям'і дзіця павінна было загінуць. А каб пазбавіць смерці яўрэйскіх дзяцей, Гасподзь загадаў яўрэям зрабіць на сваіх дзвярах знак крывёю ягняці (агнца). Бачачы гэты знак, анёл смерці праходзіў міма. Гэтая гісторыя мае працяг і ў Новым Запавеце: тут Агнцам мы называем Ісуса Хрыста, збавіцельны подзвіг якога выратаваў чалавека ад граху, праклёну і смерці. Як яўрэі былі пазбаўлены рабства ў Егіпце, так і Гасподзь, прыйшоўшы ў гэты свет і стаўшы Богачалавекам, прынёс сябе ў ахвяру за грахі ўсяго чалавецтва і пазбавіў усіх людзей рабства граху.

— Што азначае фраза, якую часта згадваюць у сувязі з Уваскрэсеннем Хрыста: «Смерцю смерць адолеўшы»?

— Сваёй смерцю Ісус Хрыстос перамог і знішчыў вечную смерць. У гэтым сутнасць свята. Уся гісторыя, апісаная ў Старым Запавеце, была падрыхтоўкай да прышэсця Хрыста ў свет, да Яго смерці на крыжы і Уваскрэсення. І ўжо больш за дзве тысячы гадоў людзі святкуюць Вялікдзень, які стаў сімвалам адкрыцця для чалавека Царства Нябеснага і магчымасці для кожнага выратавання і поўнага яднання з Богам.

УРАЧЫСТАЕ БОГАСЛУЖЭННЕ

Дзень Светлага Хрыстова Уваскрэсення — час асаблівай урачыстасці і духоўнай радасці. Вернікі збіраюцца на богаслужэнне, якое доўжыцца ўсю ноч, каб праслаўляць уваскрослага Хрыста, а ўвесь Светлы тыдзень святкуецца «як адзін дзень». Богаслужэнні Светлага тыдня блізкія па ўрачыстасці да начнога велікоднага.

Гэтае свята — урачысты ўспамін Уваскрэсення Ісуса Хрыста на трэці дзень пасля яго пакут і смерці. Зняцце з крыжа і пахаванне Госпада былі здзейснены ўвечары ў пятніцу. Паколькі субота была ў іўдзеяў днём спакою, жанчыны, якія суправаджалі Госпада і Яго вучняў з Галілеі, сведкі Яго пакут і смерці, прыйшлі да Магілы Гасподняй толькі праз дзень: на досвітку таго дня, які мы цяпер называем нядзеляй. Але труна была пустая, а анёл абвясціў тым, хто прыйшоў, што Хрыстос уваскрос.

— Не пабываўшы ў царкве, немагчыма адчуць сэнс і змест гэтага свята. Самым галоўным выяўленнем і ажыццяўленнем урачыстасці з'яўляецца ўдзел у святочным богаслужэнні, — кажа айцец Аляксандр. — Асвячэнне кулічоў і яек павінна стаць толькі часткай начной службы. Здзейсніць святкаванне Вялікадня, знаходзячыся дома за святочным сталом, без кантэксту царкоўных традыцый (або замяняючы іх народнымі, якія часта не маюць сваёй крыніцай царкву), немагчыма.

Велікодная служба пачынаецца з вечара суботы і працягваецца ўсю нядзельную ноч. Апоўначы раздаецца звон (благавест), і адначасова з яго ўрачыстымі гукамі запальваюцца ўсе свечкі ў храме. Святары ў светлым адзенні, з крыжам, свяцільнямі і фіміямам выходзяць з алтара, спяваюць сціхіру разам з прысутнымі, а затым здзяйсняюць хрэсны ход вакол царквы. Напрыканцы святочнай літургіі асвячаецца артас — хлеб з выявай крыжа і цярновага вянка.

— Падрыхтоўку да Вялікадня праваслаўны хрысціянін пачынае задоўга да свята. Вялікі пост напоўнены тэкстамі і богаслужэннямі, што настройваюць і падводзяць да разумення глыбіннага сэнсу Вялікадня, — распавядае Аляксандр Пальчэўскі. — У Страсны тыдзень — перад самым Вялікаднем — кожны дзень прысвечаны ўспаміну апошніх дзён і гадзін жыцця Ісуса Хрыста. Усё гэта варта разглядаць як адно цэлае — Вялікі пост, Страсны тыдзень і Уваскрэсенне Госпада. Не ўсе ведаюць, што свята Вялікадня доўжыцца на працягу 40 дзён, да дня Узнясення Гасподняга. На працягу 40 дзён пасля свайго ўваскрэсення Гасподзь з'яўляўся да апосталаў, падтрымліваў іх і адкрываў ім таямніцы Царства Нябеснага. І ўсе гэтыя сорак дзён мы вітаем адзін аднаго словамі «Хрыстос уваскрос!» — «Сапраўды ўваскрос!».

СІМВАЛ БОЖАЙ ПРЫСУТНАСЦІ

Па старадаўняй традыцыі, сімвалы Вялікадня — гэта куліч і фарбаваныя яйкі. Гэтыя стравы папярэдне асвячаюцца ў царкве. Здобны велікодны куліч сімвалізуе прысутнасць Госпада ва ўсіх зямных справах, яго клопат аб кожным з тых, хто жыве на зямлі.

«Не ўсе ведаюць, што свята Вялікадня доўжыцца на працягу 40 дзён, да дня Узнясення Гасподняга. На працягу 40 дзён пасля свайго ўваскрэсення Гасподзь з'яўляўся да апосталаў, падтрымліваў іх і адкрываў ім таямніцы Царства Нябеснага».

— Куліч звязаны з богаслужбовай традыцыяй — з артасам, святым хлебам, які выпякаецца ў царкве да Вялікадня і раздаецца вернікам. Артас — частка велікоднага богаслужэння. На працягу Светлага тыдня — першага пасля Вялікадня — ён урачыста выносіцца і прымае ўдзел у хрэсным ходзе. Гэтая традыцыя ўзыходзіць да тых часоў, калі пасля ўваскрэсення Хрыста апосталы, збіраючыся разам для малітвы і першых богаслужэнняў, пакідалі для Госпада месца за сталом і кавалачак хлеба, які сімвалізаваў яго нябачную прысутнасць сярод вучняў. А куліч, які пякуць у кожным доме да Вялікадня і потым асвячаюць, — правобраз артаса, які сімвалізуе прысутнасць Госпада за кожным велікодным сталом.

Куліч — сімвал Божай спагады і міласэрнасці. У рэцэпт куліча па традыцыі ўваходзяць разынкі, арэхі, мёд.

ВЕЧНАЕ ЖЫЦЦЁ І АДРАДЖЭННЕ

Яйкі на велікодным стале сімвалізуюць пачатак новага жыцця і надзею на ўсеагульнае будучае ўваскрэсенне. Найбольш распаўсюджаны колер велікодных яек, чырвоны, — сімвал Божай Любові, што перамагае сілы зла. У старажытнасці на Вялікдзень яйкі фарбавалі толькі ў чырвоны колер розных адценняў. І толькі з часам былі прыдуманы «фарбавankі» і «пісанкі» — яйкі — творы мастацтва, упрыгожаныя кветкавымі ўзорамі, арнаментам і нават мініяцюрнымі ілюстрацыямі да Евангелля.

— У аснове традыцыі фарбаваць яйкі на Вялікдзень — гісторыя, звязаная з Марыяй Магдалінай. Паводле Святога Пісання, яна распавяла рымскаму імператару Тыберыю аб Уваскрэсенні Хрыстовым. Венцаносец сказаў, паказаўшы на варыяльныя курыныя яйкі: «Я паверу ў гэта, толькі калі гэтыя яйкі стануць чырвонымі». І тут жа шкарлупіна яек пачырванела. Чырвоны колер яечнай шкарлупіны — гэта колер крыві, якую Гасподзь праліў на крыжы ў імя выратавання чалавецтва. Але дапушчальна фарбаваць яйкі і ў іншыя колеры, гэта не патрабаванне царкоўных канонаў, а асаблівасці свята.

ЧАС ДОБРЫХ СПРАЎ

З Уваскрэсеннем Гасподнім звязана шмат добрых звычаяў. Бо справы, якія здзяйсняюцца на карысць тых, хто абдзелены лёсам, дапамагаюць зняць з душы грэх. У велікодныя дні ніхто не павінен быць галодны і абдзелены радасцю. У гэтыя дні па традыцыі раздаваліся дарункі тым, хто жыве ў беднасці і нястачы. Не абдзяляліся і вандроўныя жабракі, бо ад Вялікадня да Узнясення вандруе па зямлі Хрыстос з апосталамі, выпрабоўваючы міласэрнасць і дабрыню кожнага. Так што, пашкадаваўшы міласці, ты можаш адмовіць самому Сыну Божаму.

— Але самае галоўнае, — кажа святар, — у цэнтры свята павінен быць Гасподзь і ўсё, што звязана з яго смерцю і Уваскрэсеннем. Усё тое, што ён зрабіў дзеля нашага выратавання. Часта ў сучаснай культуры на царкоўныя святы ладзяцца забаўляльныя мерапрыемствы, але мала хто кажа аб самым галоўным — аб Хрысце. Калі пераварыць Вялікдзень проста ў сямейныя вячоркі, сапраўдны змест свята будзе згублены. Вельмі важна на Вялікдзень пачытаць і паразважаць самому, пагаварыць са сваімі блізкімі, з дзецьмі пра сэнс і змест свята: чаму ўваскрос Хрыстос, што гэта змяніла і на што паўплывала? За словамі «Хрыстос уваскрос!», якія мы прамаўляем на Вялікдзень, для кожнага з нас павінен стаяць глыбокі ўнутраны змест.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

«ДОБРА, КАЛІ З СЯБРОЎСТВА НАРАДЖАЕЦЦА КАХАННЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— З будучым мужам я пазнаёмілася ў студэнцкай кампаніі. Мы часта збіраліся, ладзілі вячоркі, — распавядае Іна. — Мы ўсе сябравалі, і я неяк нікога з хлопцаў не прымярала на ролю свайго мужа. А вось сябры раілі нам звярнуць больш пільную ўвагу адно на аднаго. У нейкі момант так і адбылося. Аднойчы ў кампаніі мяне ўбачыла Мішына мама і сказала: «Добрая дзяўчынка». А потым і яго тата заявіў: «Такую б жонку для нашага Мішы!» Нягледзячы на падказкі, усё ж мы самі выбралі адно аднаго.

— Перыяд заляцанняў колькі доўжыўся?

І. Р.: — А яго як бы і не было. Мы знаходзіліся ў адной студэнцкай кампаніі, усе ўжо ведалі адно пра аднаго. Мне здаецца, гэта вельмі добра, калі з сяброўства нараджаецца каханне. Сяброўства заўсёды шчырае, а вось закаханыя стараюцца дэманстраваць найлепшую версію сябе. Гэта натуральна, што хочацца спадабацца, вобразна кажучы, з гарантыяй, але жыць жа потым не з ідэальным чалавекам, а са звычайным. Так што мы сябравалі, а потым у адзін цудоўны дзень Міша зрабіў мне прапанову.

«Мне было цікава паўтарыць вопыт бацькоўства ў больш старэйшым узросце. Зараз магу сказаць, што гэта зусім іншыя эмоцыі, чым калі ты яшчэ малады чалавек».

— Гэта значыць, сям'ю вы стварылі ў студэнцкія гады. А як вяселле спраўлялі?

М. Р.: — Не зусім так, я ўжо працаваў. У нашай сям'і прынята, што такая важная падзея адзначаецца ў коле родных і сяброў. Такія ж каштоўнасці падзяляла Іна і яе сям'я. Вядома, бацькі нам таксама дапамагалі, за што мы ім удзячныя.

І. Р.: — Так атрымалася, што гасцей прыйшло нават больш, чым мы чакалі. І пакуль для іх ставілі дадатковы стол (балазе, пачастункаў было прыгатавана з вялікім запасам), мы з Мішам спявалі. Напэўна, ні ў кога не было такога вяселля, каб на «разагрэве» ў запрошанага ансамбля выступалі самі маладыя. А калі ініцыятыву ўзялі нашы сябры, многія з якіх цяпер ужо вядомыя музыканты, сталі спяваць і граць, то арганізаваўся цэлы хор з цудоўных галасоў, выступалі разам і асобна, спявалі і арыі, і народныя песні. Увогуле, свята атрымалася, а яго музычная частка была проста ўнікальная.

— Спрэчак аб пераходзе на прозвішча мужа ў вас не было?

М. Р.: — Абсалютна, Іне падабалася маё прозвішча. А калі сур'ёзна, то мы лічым, што ў сям'і павінна быць адно прозвішча на ўсіх.

— Іна, вядомы выпадкі, калі пасля родаў у спявачак з'яўляюцца праблемы з голасам. Вы не баяліся нараджаць дзіця, будучы студэнткай?

І. Р.: — З нараджэннем Тонечкі падгадалі так, каб, як я жартую, атрымаць размеркаванне ў радзільню. Не, страху страціць голас не было, напэўна, я і не ведала аб гэтай страшылцы. Але мне казалі, што кармленне грудзьмі несумяшчальнае з прафесійнымі спевамі. Таму Тоню я карміла толькі год. Наогул, магу сказаць, што абедзве цяжарнасці для мяне прайшлі спакойна, асабліва другі трыместр — гэта проста час фантастычнага душэўнага і нават фізічнага ўздыму. Дарэчы, і кармленне грудзьмі не супрацьпаказана спявачкам — так атрымалася, што з другога дэкрэта мяне тэрмінова запрасілі праспяваць спектакль, і я зразумела, што ўсё прайшло добра. Ніхто не пацярпеў: ні дзіця, ні публіка, ні маці.

«Мы рады, што нашы дзеці любяць чытаць. Мы не прывучалі іх да чытання спецыяльна, а чыталі ім з дзяцінства, часта хадзілі ў бібліятэку, дзяліліся думкамі аб прачытаным».

— Іна, у вашым рэпертуары шмат спектакляў для дзяцей. Так склалася ці гэта ваш выбар?

І. Р.: — Гэта выбар пастаноўшчыкаў, за які я ім удзячная. Люблю ўсе свае ролі, але работа ў дзіцячых спектаклях — гэта нешта асаблівае. Правільна нават сказаць — у сямейных спектаклях, бо дзяцей прыводзяць бацькі. Так прыемна глядзець на прыбраных дзетак, якім усё цікава, якія проста чароўныя ў сваёй шчырасці.

— Мяркуючы па фотаздымках, у вашых дачок вялікая розніца ва ўзросце...

І. Р.: — Тоня ў свой час прасіла браціка ці сястрычку, але ў нас неяк не складвалася... Потым яна перастала казаць пра гэта, мабыць, страціла надзею. Мы адразу марылі, што ў нас будзе двое дзяцей. Вельмі пастаралася і нарадзіць другое дзіця мяне ўгаварыў Міша.

М. Р.: — Мне вельмі хацелася, каб у Тоні быў родны брацік ці сястрычка. Тым больш што я і Іна, як зараз кажуць, — са шматдзетных сем'яў: у нас на дваіх чатыры браты! І яшчэ мне было цікава паўтарыць вопыт бацькоўства ў больш старэйшым узросце. Зараз магу сказаць, што гэта зусім іншыя эмоцыі, чым калі ты яшчэ малады чалавек.

Калі нарадзілася Тоня, я сумяшчаў работу і вучобу ў кансерваторыі, была вельмі вялікая нагрузка, таму шмат клопатаў аб старэйшай дачцэ дасталася Іне. Да моманту нараджэння Алісы ў мяне з'явілася больш часу на сям'ю.

— Аліса вырасла татавай дачкой?

М. Р.: — Так, яна любіць падысці да мяне, абняць і сказаць: «Ты — найлепшы ў свеце татачка», а потым бяжыць да Іны, таксама абдымае і кажа: «Я цябе люблю, матуля». І гэта — адны з самых шчаслівых момантаў у жыцці.

— Як складваюцца адносіны ў дачок?

І. Р.: — Вельмі добра, яны сябруюць, і розніца ва ўзросце ў дзесяць гадоў не перашкода. А мы аднолькава моцна любім кожную з іх. Мы стараліся, каб са з'яўленнем Алісы дзяўчынкі былі разам. Нам хацелася, каб у Тоні ні на хвіліну не ўзнікла пачуццё, быццам яна сыходзіць на другі план. Мы прапанавалі старэйшай дачцэ выбраць імя для сястры. Памятаю, Алісе было гадкі тры, я прыйшла з работы, дзяўчынкі бягуць мяне сустракаць. Зручней было б абняць спачатку Алісу, потым Тоню, але я абняла іх адразу абедзвюх. І так ва ўсім.

Мы ўсе рады, што ў нас з'явілася Аліса — гэта такое засяроджанне энергіі, вакол якога ўсё закруцілася. У ёй столькі актыўнасці, выдумкі! Міша — клапатлівы і ўважлівы муж і бацька, але неяк ён ігнараваў 8 Сакавіка і 14 лютага. Мы з Тоняй дастаткова спакойна да гэтага ставіліся. А вось Аліса ў свае сем гадоў запатрабавала спачатку адзначыць дзень 14 лютага. Кажа: «Пойдзем у кавярню!». Тоня прыехала з Алісай у тэатр, у мяне скончылася рэпетыцыя, мы гатовыя ісці. А ў Мішы яшчэ ідзе спектакль. Аліска кажа: «Чакаем тату, я хачу, каб мы ўсе сядзелі за сталом, елі смачнае, а ў вас было каханне». Перад 8 Сакавіка яна пытаецца ў Мішы: «Тата, ты рыхтуешся да свята?»

М. Р.: — Вядома, трэба пастарацца стварыць атмасферу свята, бо сямейны дабрабыт і шчасце — гэта вялікая штодзённая праца, вопыт усіх папярэдніх гадоў, памылак, сумесных пошукаў і рашэнняў.

— Тоня ўжо дарослая дзяўчынка, вучыцца ў выпускным класе гімназіі-каледжа мастацтваў. Бацькі часам нараканаць, што цяжка знаходзіць агульную мову з дзецьмі ў такім узросце.

І. Р.: — Мне здаецца, яе немагчыма страціць, калі так было з самага пачатку. Мы са сваімі дочкамі шчабяталі нават тады, калі яны яшчэ толькі «агукалі». Дзяўчынкі адразу прывыкалі да галасоў бацькоў. Мы заўсёды з імі размаўлялі, усяляк давалі зразумець, што яны — важныя і значныя для нас людзі. Вядома, у кожнага з нас свой графік, часам вельмі насычаны, але ёсць непарушнае правіла: хоць бы адзін раз на дзень усім сабрацца за сталом. Не толькі для таго, каб паесці, але і пагутарыць. У нас няма на кухні тэлевізара: нам не патрэбен пяты сураз моўца, таксама забарона на гаджэты.

Мы рады, што нашы дзеці любяць чытаць. Мы не прывучалі іх да чытання спецыяльна, а чыталі ім з дзяцінства, часта хадзілі ў бібліятэку, дзяліліся думкамі аб прачытаным. Цяпер мы шмат чытаем ужо Алісе, а Тоня можа мне параіць, на якую кнігу варта звярнуць увагу.

«Напэўна, ні ў кога не было такога вяселля, каб на «разагрэве» ў запрошанага ансамбля выступалі самі маладыя».

Часам наракаюць і на тое, што «маладыя — не такія». Так, яны не такія, яны іншыя. У чымсьці — мілыя наіўныя дзеці, у чымсьці — значна больш дарослыя і больш адукаваныя, чым мы ў іх узросце. Мне вельмі цікава размаўляць з Тоняй, і я рада, што яна сваім думкамі, ідэямі дзеліцца са мной і мужам.

— Скажыце, ці знаёма вам пачуццё творчай рэўнасці?

М. Р.: — У сям'і мы падтрымліваем адно аднаго, суперажываем і радуемся любым поспехам. Як кажуць нашы сваякі, мы — творчыя людзі. За 20 гадоў у хоры Вялікага тэатра навучыўся не сапернічаць або канкурыраваць, а радавацца за калег і іх дасягненні. У Іны добра складваецца кар'ера, я таксама шчаслівы, што спяваю ў нашым хоры — гэта калектыў найвышэйшага прафесійнага ўзроўню!

І. Р.: — Рэўнасць, зайздрасць — гэта наогул не пра нас. У сям'і такія пачуцці недапушчальныя, яны проста руйнуюць. У нас вельмі моцная, з прафесійнага пункту гледжання, оперная трупа і проста па-чалавечы добрыя адносіны паміж калегамі. Таму ёсць куды развівацца, на каго раўняцца і не баяцца вострых локцяў.

У тэатры шмат сямейных пар, і з многімі мы сябруем. Нашы дзеці растуць за кулісамі, яны таксама гуртуюць сем'і калег. Кажуць, цяпер модна сустракацца з сябрамі ў кавярні — гэта таксама добры варыянт. Але нам падабаецца бываць дома адзін у аднаго — так неяк цяплей і вальней.

— А хто ў вас «галоўны бухгалтар»?

І. Р.: — Няма ў нас галоўнага. Мы ведаем, хто колькі зарабіў, разам абмяркоўваем, як рацыянальна распарадзіцца грашыма.

— Як вы любіце адпачываць?

І. Р.: — У нас ёсць абавязковае правіла: падчас адпачынку наведваць бацькоў. Едзем да майго таты на Брэстчыну — там збіраецца ўся радня, вельмі душэўна камунікуем. Кожныя канікулы я праводзіла на радзіме мамы ў Пружанах, у сваёй бабулі. Гэты горад для мяне вельмі шмат значыць. Наша дзіцячая кампанія захавалася да гэтага часу. Сяброўству не замінае тое, што цяпер у нас розны статус, дастатак, — мы з задавальненнем вяртаемся ў дзяцінства. Гэтаксама гасцюем у Гродне ў бацькоў Мішы.

Любім падарожнічаць! Пераканана, што пачынаць трэба з Беларусі. У нас столькі ўсяго цікавага! Усе ведаюць Мір і Нясвіж, а я прапаноўваю ўсім паглядзець чароўны палац у Пружанах! Калі ведаеш сваё, можна ехаць далей. Радуюся гастролям і ў Лондан, і ў Вілейку — проста люблю дарогу.

М. Р.: — Дадам, што мы аддаём перавагу адпачынку пазнавальнаму. Для нас важны момант: у адпачынак — усёй сям'ёй. Вось гэтага «адпачыць ад дзяцей» мы не разумеем. І самае важнае — настрой, здольнасць бачыць тое прыгожае, што ёсць вакол нас. Тады і шпацыр у гарадскім парку, пікнік на беразе Мінскага мора ствараюць пазітыўны настрой.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота з архіва сям'і РУСІНОЎСКІХ.

АДКУЛЬ Я ЎЗЯЎСЯ,

або Як адказаць, каб не пакрыўдзіць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Калі бацькі адчуваюць сорам і збянтэжанасць і пытанне «Мама, адкуль я ўзяўся?» паўстае знянацку, то лепш спакойна даць сабе час падрыхтавацца да размовы і супакоіцца. Альбо нават папрасіць, напрыклад, мужа пагаварыць з дзецьмі, калі для яго гэта тэма не дыскамфортная. Можна падабраць спрыяльны час і пачаць размову з прагляду фільма, мультфільма альбо роліка, дзе паказваецца развіццё эмбрыёна, а пасля ўжо размаўляць. Адным з варыянтаў дапамогі могуць стаць кнігі. Выбар патрэбнай літаратуры тут даволі разнастайны. Аднак перш чым абрацьпатрэбны «дапаможнік», не лішнім будзе бацькам самім азнаёміцца са зместам, каб ведаць, у якой падачы вы прапаноўваеце інфармацыю свайму сыну ці дачцэ. Пасля прачытання ў іх могуць узнікнуць новыя пытанні, з якімі дзеці прыйдуць непасрэдна да вас. І калі адбылося менавіта так, то гэта як мінімум нагода для радасці, што дзіця вам даверае. Значыць, і з астатнім вы справіцеся.

Перш за ўсё, не варта ўспрымаць сітуацыю стэрэатыпна, быццам гэта тое, пра што не трэба гаварыць, бо ўяўленне «прыстойна/непрыстойна» можа не супадаць у дзіцяці і дарослага. А сваёй негатыўнай рэакцыяй на зададзенае пытанне вы можаце паўплываць на стаўленне да тэмы сваіх дзяцей у дарослым жыцці і на іх успрыманне сваёй палавой прыналежнасці. Як правіла, цікавіцца будовай уласнага цела і тым, наколькі дзяўчынкі адрозніваюцца ад хлопчыкаў, дзеці пачынаюць ва ўзросце 2—4 гадоў. Тады і можа ўзнікнуць пытанне «Адкуль я ўзяўся?» У сваім адказе засяроджвайцеся менавіта на тым, пра што пытаецца ў вас дзіця, а потым давайце тую інфармацыю, якая адпавядае ўзросту малога. Напачатку можна спыніцца на тлумачэннях кшталту «клетачкі мамы і таты аб'ядналіся ў адну, і ты рос у маім жывоціку, а потым доктар у бальніцы дапамог табе выйсці адтуль». Калі ў сваім аповедзе дойдзеце да ролі таты ў працэсе з'яўлення дзіцяці, то варта патлумачыць гэта ў святле сямейных адносін, кахання ў сям'і. Галоўнае — не падманваць дзіця, а адказваць яму дакладна, зразумела, праўдзіва. Іншая акалічнасць — калі, напрыклад, сын ці дачка прыйшлі да вас з пытаннем, але ўжо і з версіяй адказу на яго ад сяброў ці той жа бабулі. Тут варта таксама ўнесці яснасць адносна інфармацыі, якую ім паведамілі, і падумаць, наколькі гэта суадносіцца з тым, што хацелі б пра гэта распавесці вы самі.

Інфармаваць дзіця ў пытаннях палавой прыналежнасці і ўзаемаадносін вельмі важна. Асабліва калі разглядаць сітуацыю з падлеткамі. Закранаць трэба псіхалагічны і фізіялагічны аспекты. Прычым у падлеткавым узросце акцэнты робяцца ўжо на тлумачэнні таго, як пазбегнуць нежаданай цяжарнасці, засцерагчыся ад магчымых захворванняў і, галоўнае, умець адмовіцца ад таго, чаго не хочаш, а можа, пакуль і не разумееш. Бо ўзаемаадносіны інтымнага характару заўсёды павінны адбывацца па ўзаемнай згодзе і жаданні. Таксама варта засцерагацца, бо могуць быць пэўныя наступствы, да якіх малады арганізм яшчэ не гатовы, і гэтак далей.

— Бацькам трэба разумець, што пагаварыць са сваім дзіцем на такія тэмы — гэта і ёсць той максімум, які з'яўляецца дасяжным. Часта дарослыя робяць памылку, калі спрабуюць ганьбіць і пагражаць, палохаць дзяўчынку цяжарнасцю, маўляў, пасля гэтага нават у дом цябе не пушчу. Узаемаадносіны з супрацьлеглым полам рана ці позна ўсё роўна здарацца, і пытанне толькі ў тым, як падлеткі будуць адчуваць сябе ў іх. Нашы дзеці павінны разумець, што маюць права адмовіцца, калі не гатовыя да такога адказнага кроку, і іх зразумеюць, калі сапраўды кахаюць. На практыцы назіраю часам, што дзяўчаты не ведаюць, як сказаць «не», бо прысутнічае страх, што тады з табой не будуць працягваць адносіны, — зазначае спецыяліст. — Сама па сабе тэма палавой прыналежнасці, узаемаадносін полаў і яе абмеркаванне фарміруюць стаўленне дзіцяці да гэтых пытанняў. Калі бацькі гавораць пра ўсё спакойна, то і для дзяцей гэта становіцца нормай. І ў будучыні такое стаўленне павышае гарантыю, што з любой важнай тэмай сын альбо дачка прыйдуць менавіта да вас, бо давяраюць. Закрананне вышэйакрэсленай тэмы — гэта свайго кшталту яшчэ і прафілактыка сексуальнай эксплуатацыі дзяцей, якая ёсць у грамадстве, але часта замоўчваецца. Бывае, што першы вопыт здараецца траўміруючым: пазней выяўляецца, што дзяўчына не можа давяраць мужчынам ці ўзнікаюць праблемы з цяжарнасцю. Іншымі словамі, усё, што адбываецца, нават калі ў дзяцінстве здаецца нязначным, потым можа адгукнуцца. Таму, дарагія бацькі, імкніцеся своечасова пачуць сваіх дзяцей і з павагай і мудрасцю стаўцеся да ўсяго, што з імі адбываецца.

Алена ДРАПКО.

ЛІТАРАТУРА БАЦЬКАМ У ДАПАМОГУ:

1. Дэбра Хафнер. «Ад пялюшак да першых спатканняў. Што павінны ведаць бацькі пра сексуальнае развіццё сваіх дзяцей».

2. Кацярына Януш. «Як я з'явіўся на свет. Для чытання дарослымі дзецям».

3. Пітэр Мэйл. «Адкуль я ўзяўся». Аўтар вядзе дыялог з чытачом-дзіцем.

4. Віржыні Дзюмон. «Адкуль я ўзяўся? Сексуальная энцыклапедыя для дзяцей 5—8 гадоў».

5. Дэры Бэйлі. «Маё цела мяняецца: усё, што хочуць ведаць падлеткі і пра што саромеюцца гаварыць бацькі».

Бяспека ў доме

«МІНЫ» ЗАПАВОЛЕНАГА ДЗЕЯННЯ

ў нашых кватэрах і не толькі

...Раніцай 22 сакавіка ў 7 гадзін 30 хвілін ратавальнікам Ельска паступіла паведамленне аб пажары ў кватэры ў адным з трохпавярховых жылых дамоў. Прафесіяналы хутка прымчаліся на месца выкліку і адразу ж заўважылі моцнае задымленне кватэры на першым паверсе. У хлопцаў з пажарнай каманды выразна, да аўтаматызму адпрацаваны ўсе дзеянні пры любой надзвычайнай сітуацыі. І цяпер перш за ўсё праводзілася разведка пакоя, які гарэў, каб, калі спатрэбіцца, ратаваць жыцці людзей. На жаль, без ахвяр не абышлося — на ложку было знойдзена абгарэлае цела гаспадыні кватэры. Жанчына пенсійнага ўзросту жыла адна.

З агнём ратавальнікі, вядома ж, справіліся вельмі хутка, а вось чалавечае жыццё вярнуць ужо нельга. Разгляданая версія прычыны пажару — парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання. Сляды трагедыі вядуць да насценнага бра.

...Кароткае замыканне электраправодкі — магчыма, гэта і стала прычынай пажару бытавога вагончыка ў Гродне. Позна вечарам 22 сакавіка жыхары дома насыпраць бытоўкі звярнулі ўвагу на дым і полымя. Ратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння, адчынілі дзверы, правялі разведку і пераканаліся, што ўнутры няма людзей. У лічаныя хвіліны агонь быў ліквідаваны.

...І зноў кароткае замыканне — версія прычыны пажару, які здарыўся ў сакавіку ў сталічнай кватэры па вуліцы Убарэвіча. Двухпакаёвая кватэра знаходзіцца на чацвёртым паверсе пяціпавярховага дома. У адным з пакояў агонь знішчыў маёмасць, а ў суседнім ратавальнікі знайшлі на падлозе нежывое цела гаспадыні кватэры.

Часта, купіўшы які-небудзь электрапрыбор, мы не вельмі паглыбляемся ў інструкцыю па яго эксплуатацыі. Гэта — пасля, калі ўжо нешта здарылася і мы хочам высветліць прычыну... Варта пастуліць наадварот: перад выкарыстаннем уважліва вывучыць інструкцыю і выконваць усе прыведзеныя ў ёй правілы. Асабліва гэта датычыцца тэрміну эксплуатацыі — перыяду, на працягу якога тэхніка можа эксплуатавацца па прызначэнні. Калі рэальны тэрмін эксплуатацыі нашай бытавой тэхнікі перавышае дазволены інструкцыяй у разы, то ў выпадку пажару вінаваціць застаецца толькі сябе. Часта старыя халадзільнікі, тэлевізары і іншыя прадметы становяцца для іх уладальнікаў «мінай» запаволенага дзеяння. Многія выкарыстоўваюць бытавую тэхніку, як той казаў, да апошняга. А пасля пакупкі новага тэлевізара або халадзільніка, як правіла, старыя «сябры» пераязджаюць на дачу, у вёску і да т. п., дзе зноў жа становяцца крыніцай небяспекі.

Сучаснаму чалавеку цяжка ўявіць сваё жыццё без камп'ютара, прынтара, сотавага тэлефона і г. д. Камфортна і зручна карыстацца электрычным чайнікам, мікрахвалёўкай ці тостарам. Аднак пры гэтым многія забываюць элементарныя правілы. Падумайце, сыходзячы з дому, якія электрычныя прыборы засталіся ў вас уключаныя ў разеткі і ці ёсць неабходнасць пакідаць іх у рэжыме чакання без вашай прысутнасці. Ніхто не можа прадбачыць, як павядзе сябе тая ці іншая прылада пасля перабояў з электрычнасцю або рэзкіх скачкоў напружання. Вядома, халадзільнік у нас уключаны заўсёды, а вось электрычны чайнік, тэлевізар, мікрахвалёўку і многія іншыя электраприборы няма неабходнасці пакідаць уключанымі без нагляду.

Смартфоны, планшэты, мабільныя тэлефоны і шэраг іншых прылад зараджаюцца ад электрычнай сеткі. Многія пакідаюць тэлефон на зарадцы на ўсю ноч. Але ці ўпэўнены вы, што праводка ў доме абароненая ад скачкоў напружання і збояў? Вы дакладна ведаеце, што ваш гаджэт не грэецца падчас падзарадкі? Не задавайцеся пытаннямі і не рызыкуйце, а толькі выконвайце простыя правілы бяспекі: не забывайце вымаць падзарадную прыладу з разеткі.

У веснавы і восеньскі перыяд, калі ацяпленне ўжо адключана або яшчэ не ўключана, мы карыстаемся абагравальнікамі, якія таксама пакідаем уключанымі на ноч, ці яшчэ «круцей» — выкарыстоўваем іх для сушкі рэчаў. Нехта карыстаецца нават самаробнымі падаўжальнікамі, электранагравальнымі прыборамі.

Ці варта здзіўляцца, што электрападаўжальнік стаў прычынай здарэння ў сталічнай краме па вуліцы Семянкі? Ратавальнікі, якія прыбылі на месца выкліку, выявілі ўзгаранне ў цокальным паверсе шаснаццаціпавярховага жылога дома. Агнём было знішчана халадзільнае абсталяванне. Але дзякуючы зладжаным дзеянням ратавальнікаў эвакуацыя людзей не спатрэбілася, ніхто не пацярпеў.

Лёгкасць у выкарыстанні і зручнасць — асноўныя вартасці сучасных электрычных прыбораў. Аднак служаць яны на радасць людзям, як правіла, да таго часу, пакуль выконваюцца правілы бяспекі і ўсе рэкамендацыі, указаныя ў інструкцыі. Атрымліваючы асалоду ад камфорту, не варта забываць разумныя меры засцярогі...

Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ, галоўны спецыяліст Рэспубліканскага цэнтра прапаганды МНС.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1:
- капитальное строение, инв. № 422/С-3647 (назначение – здание специализированное для органов государственного управления, обороны, государственной безопасности, внутренних дел, наименование – казарма), общей площадью 2033,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Островского, 35;
- капитальное строение, инв. № 422/С-27534 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – сооружение благоустройства к зданию № 35), общей площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Островского, сооружение благоустройства к зданию № 35;
- зеленые насаждения (береза, каштан).

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100004000123, площадью 0,3077 га (назначение – для содержания и обслуживания здания казармы) по адресу: г. Щучин, ул. Островского, 35.

Начальная цена продажи – 132 744 руб. (сто тридцать две тысячи семьсот сорок четыре рубля) с учетом НДС.

Сумма задатка – 13 274 руб. (тринадцать тысяч двести семьдесят четыре рубля)

Продавец – открытое акционерное общество «Молочный Мир» Щучинский филиал, 231513, г. Щучин, ул. 17 Сентября, 45, тел. 8-01514-280-03

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 06 мая 2021 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 20.02.2021 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 04 мая 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion/

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Лот 1:
- капитальное строение, инв. № 412/С-24322 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание бара «Купалинка»), площадью 124,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Мосты, пер. Заводской, 6Б;
- капитальное строение, инв. № 412/С-26754 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – наружная канализационная сеть), протяженностью 9,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Мосты, пер. Заводской, 6Б.

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 424050100015000027 (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (для размещения объектов розничной торговли)), площадью 0,0343 га, расположенном по адресу: г. Мосты, пер. Заводской, 6Б. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,0343 га

Начальная цена продажи – 55 000 руб. (пятьдесят пять тысяч рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 5 500 руб. (пять тысяч пятьсот рублей)

Продавец – Гроднооблпотребобщество (Мостовский филиал), 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-71

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 05 мая 2021 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 03 мая 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion/

ООО «Вельми Смачна» информирует покупателей (потребителей)

ОБ ОРГАНИЗАЦИИ ВОЗВРАТА КОНФЕТ ЖЕВАТЕЛЬНЫХ SARVAN FRUITAFFY в индивидуальной упаковке из полимерных материалов, в групповой упаковке массой нетто 1,0 кг, ш.к. 8699905720582 (изготовитель: Sarvan Sekerleme Gida San. Ve Tic. Ltd. Sti., Турция).

Возврат можно осуществить в месте приобретения продукции или по адресу: ООО «Вельми Смачна», **г. Минск, Логойский тр-т, д. 37, пом. 7, оф. 19.**

УНП 192955293

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ГЛХУ «Червенский лесхоз», 223232, ул. Барыкина, 16, г. Червень, Минская обл., +3751714 52384**

Предмет аукциона:
транспортные средства, спецтехника, бывшее в употреблении
Месторасположение:
Минская область, г. Червень, ул. Ленинская, ПМУ «Загорье»

Лот №	Инв. номер	Наименование	Начальная цена, с НДС, бел. руб.
1	01155066	Автомобиль грузопассажирский вагон УАЗ 396295-336 (рег. знак АК 3396-5, 2010 г. в.)	**2 754,68**
2	01155065	Автомобиль грузопассажирский вагон УАЗ 396295-336 (рег. знак АК 3394-5, 2010 г. в.)	**2 754,68**
3	01246117	Станок многопильный двухвальный Вектор 2/240	**23 244,61**

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лоту № 5 опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу от 02.03.2021 г., в газете «Звязда» от 02.03.2021 г.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390. Срок внесения задатка по **03.05.2021 г.**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденном постановлением Совета Министров РБ от 12 июля 2013 г. № 609 (далее – Положение)

Дата и время проведения аукциона: 05.05.2021 в 11.00 по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Ленинская, ПМУ «Загорье».
Дата и время окончания приема документов: 03.05.2021 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Контактные телефоны: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703**
Продавец	**ООО «МВЗ ПромСервис», 220033, Минск, пр-т Партизанский, 8, корп. 12, пом. 55**

Предмет аукциона:
транспорт, спецтехника, оборудование, бывшие в употреблении
Адрес: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 8, корп. 12

№ лота	Наименование, модель, инв. №	Инв. №	Начальная цена (без НДС), бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Машина обрабатывающая ИВ-2143П	426476	3 870,00	193,50
	Пила дисковая по металлу 315х2,5х32 мм (3 шт.)	2771864		
	Ховеркарт	5588983		
	Каркас (2 шт.)	5588733		
2	Установка экструзионная ММВЗ Н-06-86-000-00	434124	2 220,00	111,00
	Установка охлаждения оболочки троса	434123		
	Установка подачи троса	434122		

Порядок ознакомления: осуществляется по предварительному согласованию, Жогло Юрий Александрович, +375 (44) 778-67-68, пн. – пт. с 8.00 до 17.00

Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» (далее – Закон).

Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17.00 28.04.2021 заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 Закона.

Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

Порядок оформления результатов торгов: победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** со дня проведения торгов

Условия оплаты предмета аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **3 (трех) процентов** от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в ЕГРСоБ 02.03.2021, в газете «Звязда» 03.03.2021

Дата, время и место проведения аукциона: 30.04.2021 в 14.00, г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Для участия в аукционе необходимо подать организатору торгов заявление с приложением всех необходимых документов, а также перечислить задаток в срок с 9.00 **15.04.2021** до 17.00 **28.04.2021** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Контактные данные: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: info@ipmtorgi.by

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества
ОАО «Барановичский завод автоматических линий»

Предмет торгов – Лот:
1) капитальное строение с инвентарным номером 110/С-87525 (наименование: блок гаражей; назначение: здание специализированное автомобильного транспорта), площадью 53,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Королика, 2В, на земельном участке с кадастровым номером 141000000003003889 площадью 0,0075 га;
2) изолированное помещение с инвентарным номером 110/D-2780748 (наименование: пождепо; назначение: помещение транспортного назначения), площадью 446,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Королика, 8/8-4

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	97 400,00	**Размер задатка, руб.**	9 740,00

Продавец: ОАО «Барановичский завод автоматических линий», Брестская обл., г. Барановичи, ул. Королика, 8, тел./факс 80163 49 13 29.
Организатор торгов: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
Р/с для перечисления задатка: BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенного договора купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также вознаграждение Организатору аукциона

Аукцион состоится 13 мая 2021 г. в 11.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 12 мая 2021 г. до 17.00

Ранее извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Барановичский завод автоматических линий» опубликовано в газете «Звязда» от 02.03.2021

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению ГУ «Дворец культуры имени М. Горького»
(арендодатель)
проводит открытый аукцион
по продаже права заключения договоров аренды:

Наименование объекта	**Нежилое помещение (касса № 2), инв. № 610/С-36516, расположенное в здании арки филиала «Борисовский парк»**
Адрес объекта	**г. Борисов, пр. Революции, 11**
Общая пл., кв. м	11,0
Срок заключения договора аренды	3 года
Начальная цена права заключения договора аренды	46,42
Сумма задатка	4,64 бел. руб.
Размер ежемесячной арендной платы	8,25 БАВ (без учета коэффициента для отдельных видов деятельности)
Коэффициент	3
Целевое использование имущества	Для размещения офиса, организации торговли непродовольственной (продовольственной) группой товаров, предоставления услуг (кроме похоронных бюро и магазинов ритуальных услуг)

Базовая арендная величина с 01.04.2020 составляет 17,85 бел. руб. В настоящее время базовая арендная величина составляет 16,90 бел. руб. т.к. введен мораторий на увеличение базовой арендной величины по 31 марта 2022 года. В соответствии с подпунктом 2.1 пункта 2 Указа Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.

Задаток в размере 10 % от начальной цены объекта, перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан перечислить арендодателю сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор аренды имущества должен быть заключен в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Штраф в размере **2 900,00 бел. руб.** оплачивается участниками аукциона в следующих случаях:

победителем (единственным участником) аукциона в случае отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора аренды, внесения платы за право заключения договора аренды;

участниками аукциона, отказавшимися объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан несостоявшимся в соответствии с частью второй пункта 26 настоящего Положения.

победителем в случае отказа от подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится **19.05.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.05.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11, телефон для осмотра 8 (0177) 78 67 17, сайт в сети Интернет: www.rlt.by.

Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах **au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.**

УНП 600078786

ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки работ по разработке мобильного приложения и его техническое обслуживание № 2021-890576, размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по «Информационные технологии» Другое».

УНП 100357923

Извещение о проведении повторных аукционных торгов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в г. Бресте

Предмет аукциона	Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений)	
	лот № 1	лот № 2
	по ул. Леваневского, 7 в г. Бресте, на земельном участке площадью 0,2816 га	**в районе ул. Солнечной, 82/1, 82А** в г. Бресте, на земельном участке площадью 1,2790 га
Функциональное назначение земельного участка	право проектирования и строительства центра молодежного творчества с объектом общественного питания	право проектирования и строительства торгового объекта
Вещное право предоставляемого земельного участка	**в аренду сроком 50 лет**	**в аренду сроком 50 лет**
Объекты недвижимости, подлежащие сносу	объекты недвижимости КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», объекты недвижимости отдела культуры Брестского городского исполнительного комитета	объекты недвижимости ОАО «Оранчицкая птицефабрика», ОДО «Вестри», индивидуальных предпринимателей и граждан Республики Беларусь
Начальная цена продажи (руб.)	**79 101,44**	**292 139,59**
Сумма задатка (руб.)	15 800,00	58 400,00
Расходы по подготовке градопаспорта, земельно-кадастровой документации, тех. условий, АПЗ (руб.)	**6 508,22**	**14 496,63**
Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом расположенных на них объектов недвижимости, возмещаемый победителем аукциона землепользователям (руб.)	**65 520,33** *(на 24.09.2020 г.)*	**1 084 490,00** *(на 26.11.2020 г.)*
Организатор торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», г. Брест, ул. Ленина, 50-23, тел. 53-81-92, www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by		

Условия продажи

Земельный участок будет предоставляться победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившему согласие на предоставление ему предмета аукциона в аренду сроком на 50 лет для строительства и обслуживания объекта, на основании решения Брестского горисполкома об изъятии и предоставлении земельного участка, при соблюдении следующих условий:

- в день проведения аукциона будет подписан акт выбора места размещения земельного участка;
- в установленном порядке будет заключен с проектной организацией договор на разработку проектной документации на строительство объекта (с выделением при необходимости отдельных этапов) с учетом ее государственной экспертизы в срок, не превышающий два года, со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка;
- при проектировании и строительстве объекта будет учтен регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом;
- в срок, не превышающий одного года (двух лет) со дня утверждения акта выбора места размещения земельного участка, будет предоставлен в ДУП «Проектный институт Брестгипрозем» генеральный план объекта строительства с проектируемыми инженерными сетями, разработанный в составе проектной документации – архитектурного проекта или утверждаемой части строительного проекта, с учетом прохождения в установленном порядке согласования в управлении архитектуры и градостроительства Брестского горисполкома, и заключен договор подряда на разработку проекта отвода земельного участка под объект строительства;
